КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №37 (165)
◂ 9 КАСТРЫЧНІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



**МІНКУЛЬТ ЗВАРОЧВАЕ НА СУЧАСНЫЯ РЭЙКІ**

Стар. 4

**НА БАЦЬКОЎСКІХ ПАДВОРКАХ**

Адчуванне запусцення мяккай хадой крочыць следам: зыркне з вакна закінутай хаты, сіратліва паглядзіць з разбітага сямейнага партрэта

Стар. 5

**ВЫРАТАВАЦЬ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЮ**

Беспрэцэдэнтная параза нямецкіх сацыял-дэмакратаў на выбарах 28 верасня справакавала ўнутраны партыйны канфлікт

Стар. 13

**СЫН ЗА БАЦЬКУ... МАСТАК СЯРГЕЙ ВІШНЕЎСКІ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Генадзь Грушавы**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ АД РЭДАКТАРА

# КУДЫ РУХАЕЦЦА БЕЛАРУСЬ?

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Толькі не на Захад. Хто лічыць так, заўважыў у размове з расійскімі журналістамі А. Лукашэнка, той «апошні ідыёт». Але ж і не на Усход, бо як інакш разумець тую плынь беспрэцэдэнтна моцных эпітэтаў і вызначэнняў, якія ён абрынаў потым на адрас расійскага кіраўніцтва.**



Photo.ByMedia.Net

Падобна на тое, што за гэтай супярэчнасцю, як і за шэрагам іншых, якіх багата можна знайсці ў трохгадзінных адказах кіраўніка беларускай дзяржавы на выключна лаяльныя пытанні расійскіх сімпатызантаў, хаваецца той факт, што ён сам ужо не валодае адказам на гэта пытанне. Страціў свае ўласныя, яшчэ ўчора непахісна-цвёрдыя арыенціры. І ўжо не цалкам фарміруе сітуацыю, а вымушана рэагуе на ўсё новыя выклікі.

Палітыка лавіравання паміж Усходам і Захадам, як дакладна разлічаная палітыка — з кім, як, што, каму, і дзеля чаго, — вычарпала сябе. Дыялог з відавочнасцю буксуе. Бо новых крокаў насустрач з боку афіцыйнага Мінска няма. Захад чакае і трымае паўзу перад прыняццем далейшых рашэнняў, у прыватнасці па санкцыях. Палітычны вецер з Расіі дыхае холадам. Эканамічны яшчэ большым: новага крэдыту і зніжэння кошту на газ не абяцаецца. Здаецца, што сваю ранейшую палітычную вагу для Расіі страчваюць і аргументы наконт прызнання Беларуссю Абхазіі і Асеціі. Слабаватым ходам на знак прыхільнасці саюзнаму братэрству аказаліся і сумесныя вайсковыя вучэнні.

Разам з тым узмацняецца ціск унутраных выклікаў. Як сведчаць апошнія вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў у верасні бягучага года, 88 працэнтаў апытаных заўважылі рост цэн. З іх 12,5 працэнта «адчувае сапраўдны шок ад росту цэн» і яшчэ на 30 працэнтаў ён «адбіваецца сур’ёзна і выклікае трывогу». На астатніх ён «ужо адбіваецца і выклікае занепакоенасць».

На практыцы, як сказаў мой пляменнік, што працуе на заводзе, гэта азначае занятасць на 50 працэнтаў і, адпаведна, палавінную ад былой зарплату. Гэта яшчэ не сацыяльны дынаміт, але ўжо кампанент для яго. Людзі яшчэ мараць пра вяртанне да былога ўзроўню. Але не вераць ужо ў міф пра славутую стабільнасць. Гэты краевугольны камень з-пад сацыяльна-эканамічнай мадэлі А. Лукашэнкі выбіты. Прычым адказнасць за пагаршэнне эканамічнай сітуацыі людзі ўскладаюць на прадстаўнікоў улады — на прэзідэнта амаль 48 працэнтаў, на ўладу ўвогуле — 40.

Суадносяцца з гэтымі лічбамі і спадзяванні людзей на асобу, з якой яны звязваюць магчымасці паляпшэння сітуацыі. 50,2 працэнта на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах гатовыя даць шанец іншаму чалавеку, 37 працэнтаў выказаліся б за пераабранне цяперашняга лідэра, 25 — аддалі перавагу кандыдату ад дэмакратычнай апазіцыі.

Заўважна ўзрасла і геапалітычная свядомасць беларусаў. За ўступленне ў Еўрасаюз выказалася 44 працэнты, супраць — 32.

Адбудаваная ў Беларусі сацыяльна-эканамічная мадэль аўтарытарнага тыпу яшчэ захоўвае дастатковую ўстойлівасць. Аднак ужо адчувальна нахілілася, яе пранізваюць токі напружання. Падступае момант сур’ёзнага выбару далейшага палітычнага курсу краіны. Дакладней, кардынальнай змены гэтага курсу як на заходнім, так і ўсходнім накірунках. І бачыцца, што на афіцыйным палітычным полі з’явіліся новыя пункты калі не прыняцця рашэнняў, дык хаця б уздзеяння на іх змест. Гэтыя пункты пакуль далёка не самастойныя, не аформленыя, не арганізаваныя. Хутчэй за ўсё, нават не абгавораныя ў кулуарах, яшчэ цалкам залежныя ад галоўнага на вертыкальным Алімпе. Але ж з рэальнымі магчымасцямі ўплыву на сітуацыю знутры. Як на сваіх паверхах уладнай піраміды, так і па складаных, звілістых лініях міжпавярховай сувязі.

Не думаю, што міністр культуры Павел Латушка ставіў перад сабой палітычныя мэты, тым больш хацеў заявіць пра свае палітычныя амбіцыі, калі выклаў на прэс-канферэнцыі 5 кастрычніка сваю праграму, як трапна адзначылі СМІ, беларусізацыі міністэрства. Калі распавёў наконт планаў пашырэння культурных стасункаў Беларусі з краінамі Еўрасаюза з дапамогай інструментаў і пляцовак праграмы «Усходняе партнёрства». Ён вырашае лакальныя рабочыя задачы працы міністэрства. Але ў такім выразна беларускім фармаце гэтыя планы натуральна набываюць палітычнае гучанне.

Хацелася таго ці не іх аўтарам, новая канцэпцыя дзейнасці міністэрства культуры ёсць прызнанне краху яшчэ адной краевугольнай ідэі існуючай палітычнай сістэмы — безнацыянальнай культуры, безнацыянальнага патрыятызму, безнацыянальнай дзяржаўнасці ці то савецкага, ці то не зразумела якога прарасійскага тыпу. І адначасова ёсць сведчанне спробы выхаду на адбудову і развіццё сваёй нацыянальнай самабытнасці, якая і ёсць пропуск у сучасны цывілізаваны свет, у міжнародную супольнасць.

А. Лукашэнка адчувае гэтыя працэсы да перамен і імкнецца калі не спыніць іх развіццё, то хаця б падпарадкаваць сваёй волі і скіраваць у пажаданым яму накірунку. І не ведае, у якім. Крызісу няма, і крызіс ёсць, і мы ведаем, як з яго выйсці. Мы не просім у Расіі дапамогі, але чаму яна не дае крэдытаў? Захад не можа нам замяніць Расію, даць столькі, колькі давала яна, але «Усходняе партнёрства» ўхваляем. З усёй шчырай упэўненасцю: дзяржава павінна кіраваць эканомікай. І са скрухай: мы даем бізнесу ўсё больш свабоды. Дарэчы, далі ўжо столькі, што, як адзначыў адзін бізнес-аналітык з практычных структур, павярнуць назад немагчыма. Гэты працэс ужо выйшаў з-пад татальнага кантролю адміністрацыі прэзідэнта.

Калі злучыць у агульную карціну мазаіку трохгадзінных адказаў А. Лукашэнкі на пытанні расійскіх журналістаў, яго жэстаў, мімікі, паўз, то складаецца ўражанне, што ў гэтай сустрэчы ён шукаў псіхалагічнай энергетычнай падтрымкі ад прыязнай яму аўдыторыі і адначасова імкнуўся ўпэўніць і аўдыторыю, і кіроўную эліту, і насельніцтва ў сваёй непахіснасці.

Агульная сітуацыя ў краіне — пamежная. Новы адкат да поўнага аўтарытарызму яшчэ магчымы. Але з той жа верагоднасцю магчымы і прарыў да дэмакратыі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГАЛЬШАНЫ. ЗАМАК АДНАЎЛЯЦЬ НЕ БУДУЦЬ

«Мы не вядзём гаворку пра аднаўленне замка ў першапачатковым выглядзе. Але ёсць добрая ідэя па яго кансервацыі і стварэнні экспазіцыі пад адкрытым небам. Галоўнае — выкарыстаць сам брэнд «Гальшанскі замак», — заявіў старшыня Ашмянскага райвыканкама Юрый Адамчык. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валянціна Лузіна паведаміла грамадскасці, што «зараз напрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па вынясенні лініі высакавольтных электраперадач з тэрыторыі, што прылягае да замка. Гэта дазволіць потым праводзіць гідратэхнічныя работы па аднаўленні сажалак вакол помніка. І гісторыка-культурны аб'ект будзе ўспрымацца тады зусім па-іншаму». На разглядзе ў міністра культуры Паўла Латушкі знаходзіцца канцэпцыя праекта архітэктара Ігара Раханскага. Яна прадугледжвае кансервацыю замка, аднаўленне вежы, што захавалася, і правядзенне на закансерваваных руінах экскурсій.

### ГАНЦАВІЧЫ. ІРАНСКІЯ ДЫВАНЫ

У раённым краязнаўчым музеі з удзелам прадстаўнікоў амбасады Ірана ў РБ адкрылася выстава «Іранскія ручныя промыслы». На адкрыцці акрамя мясцовых чыноўнікаў і грамадскасці прысутнічалі прадстаўнікі іранскага тэлебачання. У мерапрыемстве прыняў удзел беларуска-іранскі музычны калектыў «Авіндар», які віртуозна выканаў шэраг музычных кампазіцый і песень далёкай краіны. У экспазіцыі прадстаўлены і іншыя ўзоры дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва, якія дазваляюць пазнаёміцца з традыцыямі і звычаямі іранскіх народаў. Гэта ўжо трэцяя выстава ў Ганцавічах, у правядзенні якой прымаюць удзел замежныя дыпламатычныя прадстаўніцтвы. Папярэдне ў свае экспазіцыі ў музеі выстаўлялі амбасады Японіі і Кітая ў РБ.

### ЛІДА. ДАМЕЙКУ — ВУЛІЦУ

На чарговай сесіі Лідскага райвыканкама сярод іншых было разгледжана пытанне змены назваў вуліц. Тапанімічная камісія, у склад якой уваходзяць спецыялісты, мясцовыя краязнаўцы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, прадставіла дэпутатам сваё меркаванне наконт надання новым вуліцам імя знакамітага земляка Ігната Дамейкі і назвы Грунвальдская. Пасля кароткага абмеркавання было вырашана ўшанаваць імя Дамейкі, аднак дарога на Грунвальд у сучаснай Лідзе пакуль не паўстане.

### ВІЦЕБСК. «БЕЛПОШТА» СУПРАЦЬ

Чарговая спроба незалежных выданняў «Витебский курьер» і «Отмазка» патрапіць у падпісны каталог на першае паўгоддзе 2010 года закончылася безвынікова. Выдаўцы атрымалі стандартны адказ, што РУП «Белпошта» лічыць «немэтазгодным» уключэнне газет у каталог.

▸ ВЫБАРЫ

## АГУЛЬНАЯ ДУМКА

**Дэмакратычныя сілы Беларусі сфармулююць агульную думку наконт перадвыбарнай сітуацыі.**

«Сёння па маёй ініцыятыве адбылася сустрэча прадстаўнікоў дэмакратычных партый і арганізацый. Мы абмеркавалі сітуацыю, якая складваецца ў краіне напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, і прыйшлі да высновы, што неабходна сфармуляваць агульную думку па ёй», — заявіў старшыня АГП Анатоль Лябедзька.

Лябедзька зазначыў, што на пасяджэнні тыдня ён падрыхтуе дакумент, у якім будзе адлюстравана ацэнка дэмакратычных сіл перадвыбарнай сітуацыі ў Беларусі, а таксама крокі, якія плануецца зрабіць як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. «Праз тыдзень мы збяромся яшчэ раз, каб абмеркаваць канкрэтныя палажэнні дакумента. Спадзяюся, нам удасца прыйсці да адзінай думкі», — сказаў палітык.

У сустрэчы бралі ўдзел намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Іван Анташкевіч, старшыня аргкамітэта па стварэнні Беларускай партыі працоўных Аляксандр Бухвостаў, намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Костусеў, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Віталь Рымашэўскі, лідэр руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, сустаршыня Еўрапейскай кааліцыі Мікалай Статкевіч, старшыня Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук.

**Сяргей Каралевіч, БелаПАН**

▸ ДАТА

## ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ ЗА ГОДНУЮ ПРАЦУ

**Генадзь КЕСНЕР**

**7 кастрычніка ў сталічным Парку імя 50-годдзя Кастрычніка адбыўся мітынг, арганізаваны Беларускім Кангрэсам дэмакратычных прафсаюзаў. Акцыя, у якой узялі ўдзел каля ста чалавек, была прысвечана Сусветнаму дню барацьбы за годную працу.**

Сярод тых, каго можна было ўбачыць на мітынгу, апроч прафсаюзных лідэраў і прадстаўнікоў прадпрыемстваў, былі старшыня аргкамітэту па стварэнні Народнай грамады (Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі) Мікалай Статкевіч, першы сакратар Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін, старшыня ствараемай Беларускай партыі працоўных Аляксандр Бухвостаў, актывісты дэмакратычных моладзевых арганізацый і іншыя вядомыя асобы.

Старшыня БКДП Аляксандр Ярашук нагадаў, што гэты дзень адзначаецца па ініцыятыве Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў, сябрам якой з'яўляецца і Беларускі Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў. «Прыстойная праца — гэта ўсё тое, што забяспечвае чалавеку прыстойнае жыццё. Менавіта таму Міжнародная арганізацыя працы яшчэ дзесяць год таму ўстанавіла крытэрыі прыстойнай працы», — адзначыў лідэр БКДП.

«Ці можа беларускі працоўны сёння казаць, што ён мае прыстойны заробак? — задаўся пытаннем Ярашук. — Ці можа лічыцца нармальным сярэдні заробак па краіне ў памеры 350 долараў? Не, не можа. Тым больш калі лічыць, што мы жывем у краіне з еўрапейскім узроўнем цэн». Таксама прафсаюзны лідэр звярнуў увагу на тое, што многія працоўныя заняты не поўны тыдзень, атрымліваюць урэзаныя аклады. Было згадана і пра парушэнні правоў незалежных прафсаюзаў, пра пераслед прафсаюзных лідэраў і нават простых людзей, якія жадаюць уступіць у незалежны прафесійны саюз.

Але самай балючай тэмай для прафсаюзаў і працоўных, па словах выступоўцаў, з'яўляецца прыніжальная кантрактная сістэма. Падчас акцыі выступалі рабочыя розных прадпрыемстваў, ужо існуючых і ствараемых прафсаюзаў. Практычна ўсе адзначалі хібы кантрактнай сістэмы, узгадвалі факты парушэння правоў працоўных.

Пры канцы мітынгу яго ўдзельнікі прынялі рэзалюцыю, у якой, апроч іншага, запатрабавалі адмены Дэкрэта № 29, што дзесяць год таму ўвёў у Беларусі кантрактную сістэму. Афіцыйная Федэрацыя прафсаюзаў ад адзначэння Сусветнага дня барацьбы за годную працу ўстрымалася.

▸ ПАМЯЦЬ

## ХАЙ НА НЯБЁСАХ ЁЙ БУДЗЕ СПАКОЙНА

**Мая калега-праваабаронца з Салігорска Яна Палякова сваё жыццё прысвяціла змаганню за справядлівасць. Яна Палякова заўсёды прыходзіла на дапамогу тым, каго ўлада імкнулася не заўважыць, раздавіць, прынізіць. Яна была рэгіянальным прадстаўніком грамадскага аб'яднання «Прававая дапамога насельніцтву».**

Яна Палякова дапамагла многім жыхарам Салігорска выйграць суды, абараніць свае правы перад чыноўнікамі. Здараліся нават выпадкі, калі дзякуючы кампетэнтным дзеянням Яны былі пакараныя службовыя асобы горада. Яна ўдзельнічала ва ўсіх палітычных акцыях, якія адбываліся ў Салігорску.

Здавалася б, грамадская актыўнасць павінна толькі вітацца, але не ў нас — да Яны ўсё часцей пачалі чапляцца праваахоўныя органы. Уся магутнасць сілавых структур была кінутая на адзінокую жанчыну, якая напросту спрабавала абараняць незаможных грамадзян.

І раптам заявы і скаргі Яны на неправамерныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі былі звернуты супраць яе ж. Яну абвінавацілі ў паклёпе на ўчастковага інспектара Пугачова. Суддзя Бураўцоў імкнуўся як мага хутчэй скончыць справу і вынесі прысуд — два з паловай гады абмежавання волі.

Пасля вынясення прысуду Яна ўсім сказала, што ў турму не пойдзе. І скончыла жыццё самагубствам... Вось так трагічна абарвалася жыццё праваабаронцы Яны Паляковай. Вельмі цяжка ўсведамляць, што чалавека няма з намі. Яна сышла і дала ўсім нам зразумець, што нельга так ненавідзець людзей, нельга знішчаць іх толькі за тое, што яны думаюць па-іншаму.

Яна пахавана ў Салігорску. Светлая ёй памяць. І хай на нябёсах ёй будзе спакойна.

**Алег Волчак, кіраўнік праваабарончага цэнтра «Прававая дапамога насельніцтву» (Украіна — Беларусь)**

▸ ПРЭМ'ЕРА

## БЕЛАРУСЬ ПАД НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫЯЙ

**На тэлеканале «Белсат» — прэм'ера. Новы дакументальны фільм «Беларусь пад нямецкай акупацыяй (1941–1944)» маладога рэжысёра Антося Цялежнікава.**

Трэйлер фільма «Беларусь пад нямецкай акупацыяй (1941–1944)» выклікае неадназначную рэакцыю. Ужо можна чакаць, што на аўтара абрынецца шквал крытыкі, асабліва ад тых, хто з цяжкасцю прымае меркаванні, адрозныя ад агульнапрынятых. Што прымусіла ўзяцца за такую неадназначную тэму, расказвае сам рэжысёр.

— Гэта спроба распавесці па праўдзе крыху больш дзвюх гадзін пра найбольш драматычны перыяд гісторыі Беларусі — нямецкую акупацыю 1941–1944 гадоў, першая спроба ў дакументальным кіно разглядзець гэту тэму як мага больш аб'ектыўна.

***— Гісторыя другой сусветнай вайны дастаткова няпростая і спрэчная. Чаму менавіта такая тэматыка?***

— Я з юнацтва вельмі цікаўлюся гэтай тэмай. Маё ўяўленне цалкам змянілася ад таго, як падавалася нам другая сусветная вайна ў школе ды ў безлічы фільмаў і кніг. Тэма так званай «Вялікай Айчыннай» сталася ідэалагічнай зброяй у савецкай сістэме. Безумоўнасць, з якой усхвалялася перамога СССР над Германіяй і гераізм савецкага народу, не пакідала месца для альтэрнатыўнага пункту гледжання. Вельмі часта розныя падзеі гэтага часу фабрыкаваліся на карысць савецкай ідэалагічнай лініі. Таму, сутыкнуўшыся з шэрагам публікацый, якія паказвалі зусім іншы погляд на гэтую тэму, я быў агаломшаны. Натуральна, стварэнне падобнага фільму палічыў проста неабходным. Я гатовы да ўсялякай рэакцыі і разумею, што для сярэдняга беларускага абывацеля змест фільму можа быць нават шакуючым. Самае істотнае для мяне — данесці альтэрнатыўную і максімальна аб'ектыўную карціну не такіх ужо і далёкіх падзеяў з гісторыі нашай краіны.

***— Што выкарыстоўвалася ў якасці факталагічнага матэрыялу?***

— Гістарычнай асновай для стварэння фільму сталася кніга гісторыка Юрыя Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» — адна з найлепшых прац на дадзеную тэму. Работа над фільмам пачалася яшчэ год таму, найбольш часу заняла збіранне кіна- і фотаматэрыялаў, дакументаў.

***— Асабіста з вашых сваякоў нехта ўдзельнічаў тады ў баявых дзеяннях?***

— Большасць маіх сваякоў падчас акупацыі былі яшчэ дзецьмі. Гэта былі звычайныя жыхары беларускіх вёсак, але былі і тыя, хто ваяваў на фронце на савецкім баку. Сваякі ўзгадвалі ў размовах нямецкія карныя акцыі. Яны жылі ва Усходняй Беларусі, дзе не панавала цывільная адміністрацыя, таму ім давялося пабачыць шмат непрыемнага.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПУЦІН, GO HOME?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Здаецца, адным сваім выступам перад расійскімі журналістамі Аляксандр Лукашэнка зрабіў усё, пра што так марылі беларускія ультранацыяналісты. У параўнанні з тым, што Лукашэнка «прад'явіў» былому прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, крычалка «Чамадан — вакзал — Расія» выглядае дзіцячым лепятаннем. Зараз адносіны з Расіяй, прынамсі, у беларускага прэзідэнта, сапсаваліся надоўга.**

Паводле словаў Лукашэнкі, менавіта Пуцін «замарозіў» беларусаў у 2004-м. «Гэта рашэнне было прынята тагачасным прэзідэнтам Пуціным», — сказаў ён. Больш за тое, менавіта Пуцін сарваў пабудову Саюзнай дзяржавы. «Хіба была б праблема ў хуткім прасоўванні стварэння і развіцця Саюзнай дзяржавы, калі б была на гэта воля Пуціна і Лукашэнкі? Не было такой волі, і гэты працэс шмат у чым прытармазіўся. Не Лукашэнкі ў гэтым віна», — заявіў беларускі прэзідэнт. І яшчэ Лукашэнка заявіў, што Расія сама вінаватая ў тым, што Беларусь да гэтага часу не прызнала незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. «Мы адназначна занялі пазіцыю Расійскай Федэрацыі, падтрымаўшы на ўсіх узроўнях. Па вялікім рахунку, мы даўно павінны былі прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію — не мае значэння, што там адбылося, — тым самым падтрымаўшы нашага саюзніка. На жаль, сам саюзнік вінаваты ў тым, што мы дагэтуль не вырашылі гэтае пытанне», — заявіў Лукашэнка.

Адказ на гэтыя словы не прымусіў сябе доўга чакаць. На сустрэчы прэм'ераў Расіі і Беларусі — Пуціна і Сідорскага, якая адбылася на гэтым тыдні, расійскі экс-прэзідэнт і прэм'ер дэманстратыўна «не заўважаў» словы Лукашэнкі, і ніяк не каментаваў ягоныя выказванні. Нібыта беларускага прэзідэнта не існуе ў прыродзе. Але ж Пуцін не пакінуў без увагі іншы аспект беларуска-расійскіх адносінаў. Беларусь карыстаецца «самымі льготнымі ў СНД і ў свеце» цэнамі на энерганосьбіты з Расіі, зазначыў Пуцін, адкрываючы 6 кастрычніка перамовы з беларускім калегам Сяргеем Сідорскім. Паводле слоў Пуціна, паніжаныя пошліны на нафту забяспечваюць загрузку беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў і дазваляюць ім ажыццяўляць дастаткова вялікі аб'ём экспарту, які «прыносіць значныя даходы ў цвёрдай валюце ў беларускі бюджэт».

«Халодная сустрэча» Пуціна з Сідорскім выклікала значную плынь каментараў. Прыкладам, некаторыя эксперты мяркуюць, што ў такой сітуацыі пасяджэнні Савета міністраў і Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якія плануецца правесці ў Маскве ў кастрычніку і лістападзе адпаведна, непажаданыя.

«Па-першае, спадар Пуцін не сцвярджаў, што пасяджэнне Саўміна 28 кастрычніка і на самай справе адбудзецца, а па-другое, гаварыў аб Вышэйшым дзяржсавеце так, як быццам на ім ніхто, акрамя Сяргея Сідорскага, прадстаўляць Беларусь не будзе і, галоўнае, не зможа. (І на самой справе, цяжка сабе ўявіць, што Аляксандр Лукашэнка пасля ўсяго сказанага ім як ні ў чым не бывала прыедзе ў Маскву, а расійскае кіраўніцтва яго як ні ў чым не бывала прыме. Гэта значыць, у інтарэсах і таго, і другіх не бачыцца адзін з адным)», — піша расійская газета «КоммерсантЪ». Звычайна «Ъ» ведае, пра што гаворыць, а бязменны карэспандэнт газеты з «крамлёўскага пулу» Андрэй Калеснікаў мае шырокае кола знаёмых у Адміністрацыі прэзідэнта Расіі. Менавіта ён і падаў інфармацыю пра мажлівы зрыў сустрэчы беларускага і расійскага прэзідэнта.

Іншы адказ Беларусь атрымала і ад віцэ-прэм'ера ўрада Расіі, міністра фінансаў Аляксея Кудрына 5 кастрычніка. Расія не дасць Беларусі апошні транш крэдыту ў памеры 500 мільёнаў долараў, але будзе прасоўваць інтарэсы краіны па міжнароднай лініі — па атрыманні займаў ад МВФ і антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Пра гэта заявіў віцэ-прэм'ер урада Расіі, міністр фінансаў Аляксей Кудрын 5 кастрычніка ў Стамбуле, дзе праходзіць гадавая сесія МВФ і Сусветнага банка. «Пакуль мы не разглядаем працяг крэдыту Беларусі (апошні транш на 500 мільёнаў долараў з заяўленага раней стабілізацыйнага крэдыту ў 2 мільярда). На двухбаковай аснове не дадзім», — сказаў Кудрын.

Што застаецца рабіць Беларусі? Толькі арыентавацца на Захад альбо падтрымліваць сваю незалежнасць і сваю дзяржаўнасць. І крокі на гэтым напрамку робяцца такія, якіх мы не чакалі нават ад самага нацыяналістычнага ўрада.

Падчас прэс-канферэнцыі 5 кастрычніка, прысвечанай Дню работніка культуры, міністр культуры Павел Латушка акрэсліў прыярытэты сваёй дзейнасці, якія шмат каго прымусілі спачатку ўраніць, а потым падняць сківіцу з падлогі.

Сярод прыярытэтаў былі названыя: даступнасць культуры, як унутранай, так і знешняй; культура як імідж краіны; падтрымка маладых талентаў; захаванне гістарычнай спадчыны. Павел Латушка зазначыў таксама, што «ў апошні час павялічылася фінансавая падтрымка ўстаноў культуры ў Беларусі». Разам з тым, спадар міністр прапанаваў бізнесу актыўней падтрымліваць культурныя праграмы і мерапрыемствы, у якасці прыкладаў назваўшы стварэнне сістэмы прадзюсерства ў краіне.

Шмат увагі Латушка надаў міжнароднаму супрацоўніцтву ў сферы культуры, у тым ліку і ў межах «Усходняга партнёрства». «Нас аб'ядноўвае з Літвой і Польшчай адзіная культурная спадчына», — зазначыў міністр. Супрацоўніцтва з гэтымі краінамі ў галіне рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры было названа прыярытэтным. На гэтыя мэты ў 2010 годзе плануецца выдзеліць 50 мільярдаў рублёў.

Асобна спадар Латушка згадаў пра супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай. «Важна, што аднаўляецца дыялог. Мы будзем актывізаваць яго. Гэта падыход кіраўніцтва нашай дзяржавы», — адзначыў міністр і запэўніў, што Беларусь будзе спрыяць адкрыццю беларускіх культурных цэнтраў за мяжой. Найперш у Літве, Расіі, Украіне.

Завяршаючы прэс-канферэнцыю, міністр адзначыў, што плануе правесці рэарганізацыю Міністэрства культуры: «З мэтай актывізаваць працу ўстановы. Яе ўзаемадзеянне з рэгіёнамі». А развітваючыся з журналістамі, спадар міністр параіў кожны свой дзень пачынаць з беларускага слова: «Важна змяніць стаўленне грамадства да беларускай культуры».

Штосьці вельмі буйное здохла ў лесе, калі беларуская мова і беларуская культура раптам сталі прыярытэтам развіцця грамадства, — хаця б у асобна ўзятым міністэрстве. Дарэчы, Латушка і раней заяўляў, што Мінкульт павінен стаць узорам для іншых міністэрстваў. Паглядзім, якія наступствы гэта выкліча.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### БАТЭ І ВІКТАР ГАНЧАРЭНКА



Футбольная каманда БАТЭ з Барысава пад кіраўніцтвам Віктара Ганчарэнкі датэрмінова, ужо шосты раз, заваявала чэмпіёнскі тытул у чэмпіянаце Беларусі. Гэта стала зразумела пасля разгромнага матчу з наваполацкім «Нафтанам», у якім БАТЭ выйшаў пераможцам з лікам 4:0. Цяпер барысаўскія футбалісты недасяжныя для мінскага «Дынама», што знаходзіцца на другім месцы турнірнай табліцы.

Да гэтага БАТЭ заваёўваў залатыя медалі ў 1999, 2002, 2006, 2007 і 2008 гадах. У мінулым сезоне барысаўчане забяспечылі сабе першае месца за два тура да фінішу. Па колькасці тытулаў БАТЭ знаходзіцца на другім месцы пасля мінскага «Дынама», якое перамагала сем раз — у чэмпіянатах 1992, 1992/93, 1993/94, 1994/95, 1995, 1997 і 2004 гадоў.

На групавой стадыі Лігі Еўропы пасля дзвюх першых сустрэчаў у еўракубкавых спаборніцтвах БАТЭ мае дзве паразы — ад партугальскай «Бенфікі» і англійскага «Эвертана».

### АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ



Палітык Алесь Міхалевіч рыхтуе прэзентацыю сябе і сваёй выбарчай прэзідэнцкай кампаніі, якую прадставіць у другой палове кастрычніка. Алесь Міхалевіч лічыць, што кандыдата неабходна вылучаць за некалькі гадоў да выбараў. «Тыя кандыдаты, якія будуць вылучаныя за паўгады, за сем месяцаў, будуць заведама пройгрышнымі кандыдатамі. У іх не будзе магчымасці і часу на тое, каб правесці эфектыўную выбарчую кампанію», — падкрэслівае палітык. Цяпер ён працуе з асобнымі людзьмі, размаўляе, фарміруе ініцыятыўную групу па зборы подпісаў. «Раблю ўсё магчымае для таго, каб усе тэхнічныя моманты для фармальнага вылучэння — перш за ўсё гэта збор ста тысяч подпісаў — былі праведзены ў максімальна хуткія тэрміны і вельмі эфектыўна. Таму сёння я працую над фармаваннем такіх, назавём гэта так, абрысаў свайго будучага перадвыбарчага штаба», — дзеліцца планамі патэнцыйны кандыдат на прэзідэнцкі фатэль. Найперш Алесь Міхалевіч разлічвае на падтрымку ў невялікіх гарадах і мястэчках. У выбарчай кампаніі збіраецца ўдзельнічаць у любым выпадку, незалежна ад таго, ці будуць унесеныя змены ў выбарчае заканадаўства.

### ЗМІЦЕР САСНОЎСКІ

Кіраўнік гурта сярэднявечнай музыкі «Старыя Ольса» Зміцер Сасноўскі працуе над манаграфіяй — першым падручнікам па гісторыі беларускай камернай музыкі — ад ігры на першабытных інструментах, знойдзеных археолагамі на тэрыторыі Беларусі, да падзей сярэдзіны XX стагоддзі. Пра гэта музыка паведаміў у інтэрв'ю БелаПАН падчас фэсту старажытнай музыкі «Гальшанскі замак». «Дзесяць гадоў таму я не думаў, што мы станем заснавальнікамі новага кірунку ў беларускай камернай музыцы, — сказаў Сасноўскі. — У 1999-м ніхто з удзельнікаў «Старога Ольсы» не думаў пра тое, што мы будзем жыць толькі музыкай і стала выступаць. Праз дзесяць гадоў я магу ўпэўнена сказаць, што «Стары Ольса» — гэта надзейна і надоўга, гэта — лёс».

У аснове фонду музычных інструментаў групы — асабістая калекцыя Сасноўскага, якая ўжо значна пашырылася. За дзесяць гадоў калектыў выпусціў сем альбомаў і рэалізаваў музычны праект — аўдыёспектакль па легендзе Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя роспачы». На замежных гастролі прыходзіцца прыкладна шостая частка ўсіх канцэртаў «Старога Ольсы». «Выступы за межамі краіны, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў прыхільнікаў старажытнай музыкі, даюць магчымасць зарабіць і граць бясплатна для айчынных прыхільнікаў нашай групы», — зазначыў музыка.

У планах «Старога Ольсы» — праца над нотамі рукапіснага зборніка старажытнай беларускай музыкі XVI — XVII стагоддзяў "Полацкі сшытак". Па меркаванні Сасноўскага, для засваення гэтага «вялізнага скарбу» айчыннай музычнай культуры групе спатрэбіцца не менш за пяць гадоў.



СПРАВАЗДАЧА

# МІНКУЛЬТ ЗВАРОЧВАЕ НА СУЧАСНЫЯ РЭЙКІ

Вольга ХВОІН



Фота Юрыя Дзядзінкіна

**Праз чатыры месяцы пасля прызначэння міністр культуры Беларусі Павел Латушка выступіў з падрабязнай справаздачай пра зробленую працу, а таксама паабяцаў рэалізаваць шэраг праектаў, якія мусяць паспрыяць развіццю гэтай сферы. Паводле слоў маладога і надзвычай актыўнага міністра, надышоў час пераходзіць ад дзяржзамовы да працы ў рэчышчы рынку, то бок на грунце самаакупальнасці і інстытута прадзюсерства. Да таго ж Павел Латушка паабяцаў у бліжэйшай будучыні правесці рэарганізацыю Міністэрства культуры.**

## Фарміраванне іміджу праз культуру

Міністр культуры Беларусі Павел Латушка лічыць, што культура з'яўляецца адным з важнейшых фактараў у фарміраванні іміджу краіны па-за яе межамі. У сувязі з гэтым ён звяртае ўвагу на неабходнасць пашырэння міждзяржаўнага супрацоўніцтва, а таксама на стварэнне за мяжой шэрагу культурніцкіх беларускіх цэнтраў. У наступным годзе Дні культуры Беларусі пройдуць у Кітаі, Славеніі і Вугоршчыне, у Расіі будзе абвешчаны Год культуры Беларусі, а ў нашых краінах-суседках — Польшчы, Літве, Украіне, Латвіі — адбудзецца цэлы шэраг культурніцкіх акцый.

Так, Міністэрства культуры накіравала запрашэнне міністру культуры Польшчы наведаць Беларусь з візітам. Плануецца сумесна ажыццявіць інагурацыю Года Шапэна ў Беларусі, што будзе абвешчана як сусветная акцыя.

«Мы зацікаўленыя супрацоўнічаць у рэканструкцыі і рэстаўрацыі помнікаў, музеефікацыі аб'ектаў сумеснай гісторыка-культурнай спадчыны. Мы зацікаўленыя ва ўсталяванні прамога супрацоўніцтва Нацыянальных музеяў і бібліятэк Беларусі і Польшчы, сумесным удзеле ў фестывалях тэатраў, тэатраў народнага мастацтва і фальклору. Будзем працаваць над унясеннем Аўгустоўскага каналу ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА», — падкрэсліў міністр.

У прыватнасці, Павел Латушка спадзяецца, што бліжэйшым часам будзе завершана культурніцкая акцыя, якую ён распачаў яшчэ ў статусе пасла Беларусі ў Польшчы: польскі бок перадасць нашай краіне копію партрэтаў з нясвіжскай калекцыі Радзівілаў, якая ў 1950 годзе была перададзена Польскай народнай рэспубліцы па рашэнню ўрада БССР.

Шчыльная супраца наладжана і з Літвой. Напрыклад, адзін з літоўскіх тэатраў будзе ўдзельнічаць у міжнародным тэатральным фэсце «Панарама», які 7 кастрычніка адкрыецца ў Мінску, абмяркоўваецца варыянт сумеснай прэзентацыі культур Беларусі і Літвы ў штаб-кватэры Еўрасаюза ў Брусэлі. Шэраг праектаў у сферы культуры будзе рэалізаваны ў межах праграмы «Усходняе партнёрства». У іх ліку — праца беларуска-літоўскай экспертнай групы па культурнай спадчыне і стварэнне сумеснага беларуска-літоўскага мастацкага фільма, прысвечанага 600-годдзю Грунвальдскай бітвы.

Ужо ў гэтым месяцы пройдзе сумесная калегія міністэрстваў культуры, спорту і турызму па пытанні развіцця айчыннага турызму. На ёй у шэрагу іншых будуць разгледжаныя беларуска-літоўскі праект «Замкі ВКЛ» і нацыянальны «Залатое кальцо Беларусі».

Латушка нагадаў, што сёлета адбыўся З'езд беларусаў свету, у якім прынялі ўдзел і прадстаўнікі ўлады. «Вельмі важна, што адноўлены дыялог, — падкрэсліў міністр і паабяцаў, што «Міністэрства культуры будзе працягваць і пашыраць супрацоўніцтва ў сферы культуры з беларусамі замежжа».

## Кіно будзе

Сёлета на кінастудыі «Беларусьфільм» плануецца выпусціць 12 мастацкіх фільмаў і 5 мультыплікацыйных. Латушка назваў адметнай з'явай у беларускай кінематаграфіі стварэнне мастацкай стужкі «Дняпроўскі рубеж», прымеркаванай да святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аднак міністр падкрэсліў, што за новым паваротам у развіцці культуры ў Беларусі мусіць стаяць інстытут прадзюсерства.

«Калі мы хочам бачыць будучыню ў шоу-бізнесу ў Беларусі, нам трэба засяродзіцца на развіцці сістэмы прадзюсерства ў краіне. Гэта тое, што будзе важнейшым фактарам развіцця беларускай эстрады і кінавытворчасці. Мы зацікаўленыя ў з'яўленні новых ідэй у сферы культуры», — заявіў Павел Латушка. Ён заклікаў усіх, хто мае новыя праекты і ідэі, прапаноўваць іх Мінкульту, паабяцаўшы, што кожная такая заява будзе разгледжаная. Магчыма, дзякуючы такой палітыцы, «Беларусьфільм» урэшце зменіць сваю нефармальную назву «Партызанфільм» і пачне радаваць гледачоў насамрэч запатрабаванымі і цікавымі стужкамі.

## На гастролі сваім ходам

Міністэрства культуры мае намер стымуляваць гастролі беларускіх артыстаў і мастакоў. Але і тут рыхтуецца глеба да новых умоў працы. «Як новы міністр, я разлічваю на дзейнасць дырэктараў, адміністратараў, якія адказваюць за працу таго ці іншага калектыву. Прайшоў час, калі можна было чакаць, што хтосьці прыйдзе і прапануе гастролі за мяжой. Трэба больш актыўна выходзіць на партнёраў у розных краінах свету, прапрацоўваць магчымасці ўдзелу ў розных фестывалях», — адзначыў кіраўнік культурніцкага ведамства.

Таксама чыноўнік паведаміў, што ўжо пачалася рэалізацыя плана па стварэнню апякунчых саветаў, што, паводле яго слоў, дазволіць прыцягнуць сродкі прыватных асобаў і развіць мецэнацтва.

Дарэчы, у шэрагу амбітных планаў Мінкульта — праект па запрашэнню ў Беларусь зорак сусветнага опернага мастацтва, напрыклад, Хасэ Карэраса.

Што тычыцца музеяў краіны, то Латушка прапанаваў уводзіць новыя формы працы. У якасці прыкладу ён прывёў музей народнай творчасці і побыту ў Дудутках, дзе наведвальнікі могуць і падкову на шчасце выкаваць, і гаршчок з ганчаром сабе на памяць зляпіць. «Музеі павінны развівацца і як інфармацыйныя сістэмы, — гаворыцца ў афіцыйным прэс-рэлізе Міністэрства культуры. — Сёння запатрабаваны віртуальныя экскурсіі, інтэрнэт-каталогі. Паспяхова працуе ў гэтым накірунку калектыў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, які ў красавіку 2009 года на конкурсе «Інтэрнэт-прэмія Ціба–2009» стаў пераможцам у намінацыі «Культура і мастацтва» з праектам «Музеі Беларусі».

## Сумесная ахова спадчыны

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры Антось Астаповіч можа быць усцешаны. Калі дагэтуль дзяржава глядзела на грамадскія ініцыятывы, што працуюць у рэчышчы аховы помнікаў, як на перашкоду, то цяпер ім быццам бы дадзена зялёнае святло.

Прынамсі Павел Латушка заявіў, што «трэба пашырыць удзел грамадскасці ў выпрацоўцы рашэнняў і падыходаў да спраў спадчыны праз грамадскі назіральны савет пры Міністэрстве культуры, якія быў створаны яшчэ ў 2002 годзе». З часам можна будзе зрабіць высновы, ці насамрэч дзеянні Мінкульта адпавядаюць заяве міністра. Цяпер у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь знаходзяцца 4 787 аб'ектаў.

Рыхтуюцца матэрыялы для ўключэння аб'ектаў спадчыны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Размова вядзецца пра палацава-паркавы ансамбль у Гомелі, фартыфікацыйныя збудаванні крэпасці ў Брэсце, драўляную архітэктуру Беларускага Палесся, царкоўнае дойлідства Беларусі абарончага тыпу.

## Як утрымаць культуру ў вёсцы?

Звыш 70 працэнтаў выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў размяркоўваюцца ва ўстановы культуры рэгіёнаў. У кожную вобласць накіроўваюцца маладыя спецыялісты па спецыяльнасцях «Харэаграфічнае мастацтва», «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Народная творчасць». Амаль кожны трэці выпускнік накіраваны ва ўстановы культуры сяла і аграгарадкоў.

Аднак, як паведаміў намеснік міністра культуры Віктар Кураш, прыблізна траціна з маладых спецыялістаў пасля таго, як адпрацоўць па размеркаванню, з'язджаюць з вёсак і маленькіх гарадкоў. Прычын таму мноства, але найбольш істотныя, відаць, гэта невысокі заробак (за першае паўгоддзе сярэдні заробак у работнікаў сферы культуры склаў 703 тысячы рублёў, у той час як сярэдні па краіне — 937 тысяч рублёў) і праблемы з жыллём. Работнікаў культуры, паводле дзяржаўнай праграмы, няма ў спісе на выдзяленне бясплатнага жылля ў вёсках. Варта дадаць, што 12 працэнтаў работнікаў сферы культуры ўжо дасягнулі пенсійнага ўзросту.

ЦІКАВА

# «ПАНАРАМА» ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

**З 7 па 31 кастрычніка ў Мінску праходзіць IV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Панарама».**

Форум адкрыўся спектаклем «Пінская шляхта» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў выкананні акцёраў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Праграма першых дзён фестывалю складзена з беларускіх спектакляў. Купалаўскі тэатр таксама пакажа пастаноўку «Вяселле» паводле Антона Чэхава. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага прадставілены на фестывалі спектаклем «Бег» паводле Міхаіла Булгакава.

Сучасную драматургію, п'есы расійскіх аўтараў Пятра Гладзіліна, Ксеніі Драгунскай і вядомага ірландскага драматурга Марціна МакДонаха прадставяць на форуме Тэатр юнага гледача, Тэатральны праект Каці Агароднікавай і Новы драматычны тэатр. Беларускі дзяржаўны тэатр лялек і Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі пакажуць спектаклі паводле п'ес беларускіх аўтараў — «Чаму старэюць людзі?» Анатоля Вярцінскага і «Раман + Юлія» Дыяны Балыкі. Пастаноўкамі «Не танцы» і «Пасля» на фестывалі прадстаўленая сучасная беларуская харэаграфія.

У межах беларускай праграмы таксама будзе прадэманстраваны традыцыйны праект «Тэатр On-line». На працягу вечара на сцэне тэатра імя Янкі Купалы будуць паказаны ўрыўкі, падрыхтаваныя маладымі беларускімі рэжысёрамі і драматургамі. Упершыню на фестывалі заяўлены праект «Тэатральны SOUND». У ім будуць задзейнічаны музычныя гурты, удзельнікі якіх непасрэдна звязаны з тэатрам: «ДетиДетей», «Серебряная свадьба», Дзяніс Паршын і група «StepHoll», «9-ты міліметр», «Маланка orchestra» і «Нака», а таксама ўзорны дзіцячы хор «Радасць» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

У межах міжнароднай праграмы фестывалю будуць паказаныя спектаклі тэатраў са Швейцарыі, Латвіі, Расіі, Польшчы, Літвы, Венесуэлы, Эстоніі, Італіі. Расійская праграма — самая аб'ёмная і прадстаўлена лаўрэатамі расійскіх прэмій «Залатая маска» і «Залаты сафіт». Сваю працу — «Навальніцу» Аляксандра Астроўскага — прадэманструе Драматычнага тэатра імя А. С. Пушкіна з Магнітагорска. Гэты абласны тэатр летась быў прызнаны ў Расіі лепшым.

**Паводле БелаПАН**

ПРЭС-ТУР

# ПАД КРЫЛОМ ЧАРНОБЫЛЯ

Генадзь КЕСНЕР

**На мінулым тыдні група прадстаўнікоў СМІ — сябраў ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» наведала шэраг гарадоў Беларусі, якія знаходзяцца ў зоне, пацярпелай ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Адным з пунктаў нашага прэс-туру быў Брагін — раённы цэнтр у Гомельскай вобласці.**



Брагін знаходзіцца на паўднёвым усходзе краіны, на адлегласці ў 357 кіламетраў ад Мінска і ў 119 кіламетрах ад Гомеля. У выніку катастрофы на ЧАЭС і радыяцыйнага забруджання г.п. Брагін апынуўся ў зоне з правам на адсяленне, у выніку чаго яго пакінулі каля 70 працэнтаў жыхароў. Сёння Брагін знаходзіцца ў зоне забруджання, літаральна ў некалькіх кіламетрах ад Палескага радыеэкалагічнага запаведніка. Толькі ў самім Брагіне пасля чарнобыльскай трагедыі было знесена 339 хат.

У суседнім з Брагінам Хоцніцкім раёне працягваецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы па адсяленні вясковых жыхароў і пахаванні вёсак, што выклікае хвалю абурэння ў месцічаў.

«У Брагінскім раёне адсялення больш не будзе, — запэўніў журналістаў Валянцін Іванавіч Гануш, намеснік старшыні райвыканкама. — Яшчэ гады два таму меркавалася адсяліць яшчэ 4 вёскі, дзе заставалася мала жыхароў, усе бегалі, рыхтавалі дакументы, а потым грошай на адсяленне не далі, і справа спынілася. Цяпер хто сам выязджае да сваякоў, хто вымірае... У нашым раёне да аварыі было каля 40 тысяч насельніцтва, зараз засталося 16 тысяч чалавек. Адсяленне з самога Брагіна праходзіла ў 1991–1994 гадах, людзі пераязджалі ў розныя рэгіёны, у тым ліку і ў Мінск. Было ў нас 5,5 тысячы жыхароў, а пасля адсялення засталіся 2 тысячы. Сёння ж у Брагіне ўжо 3,5 тысячы насельніцтва, ёсць чарга на жыллё, усяго 347 сем'яў зараз чакаюць кватэры».

Па словах Валянціна Гануша, сёння ў мясцовай школе вучацца 830 дзяцей, у Брагін прыязджае моладзь, і цяпер нараджальнасць (менавіта ў Брагіне — падкрэсліў намеснік старшыні райвыканкаму) перавышае смяротнасць. На маё пытанне, што робіцца з вырашчанай на забруджаных палях прадукцыяй, ці застаецца яна ўнутры раёна, Валянцін Гануш адказаў, што «забруджанае збожжа ідзе на вытворчасць спірту, з малака атрымліваецца чыстае масла». «Што тычыцца мяса, то мы працуем у такім накірунку, што адразу жывёла ўзрошчваецца на розных кармах, а потым ужо цягам месяца жывёлу харчуюць кукурузным сіласам, бо кукуруза практычна не назапашвае радыяцыі, і практычна ў нас у апошнія гады спыніліся вяртанні прадукцыі з мясакамбінатаў, што раней мела месца па прычыне радыяцыйнай забруджанасці мяса», — паведаміў суразмоўца.

Па словах Валянціна Гануша, сёння ў Брагіне хапае настаўнікаў, але адчуваецца недахоп медыкаў. «Яны прыязджаюць на два гады, папрацуюць і з'язджаюць, хаця мы будуем «чарнобыльскае» жыллё, і ўсе яны маюць дах над галавой, — кажа прадстаўнік выканаўчай улады. — А вось касцяк настаўнікаў у нас ужо стабілізаваўся, і ў раёне, і ў самім Брагіне».

Раз на год мясцовыя дзеці, паводле слоў спадара Гануша, выязджаюць на аздараўленне ў беларускія санаторыі, а вось адпачынку па-за межамі краіны брагінскім хлопчыкам і дзяўчынкам ужо не прапануюць. «Бываюць невялічкія групы, але такія паездкі за мяжу амаль спыніліся. Чым нашы санаторыі горшыя? З іншага боку, і на Захадзе Чарнобыль пачынаюць забываць, у іх зараз іншыя праблемы — Косава, Албанія, перад гэтым была Югаславія... Да таго ж, каб прынясць дзіця, трэба мець кучу грошай, а зараз у свеце крызіс», — лічыць Валянцін Гануш.

Па яго словах, у 1986 годзе, калі людзі выязджалі з Брагіна і раёна, яны атрымлівалі кампенсацыю за жыллё, за садовыя пасадкі. «Сёння ўсе выплаты спыніліся, бо грошай у дзяржавы няма», — канстатаваў Валянцін Гануш. Апроч таго, намеснік старшыні Брагінскага райвыканкама выказаў меркаванне, што тэрмінова высяляць людзей пасля выбуху трэба было не з 30-кіламетровай зоны, але ў радыусе 100 кіламетраў. Сёння ў самім Брагіне ўзровень радыяцыі складае ад 40 да 70 мікрарэнтген за гадзіну, а ў выселеных мясцовасцях і цяпер радыяцыя сягае да 1 рэнтгена за гадзіну. «А калі мы замералі ўзровень радыяцыі праз тры дні пасля выбуху, 29 красавіка 1986 года, то радыяцыя была 180 мілірэнтген за гадзіну — у тысячу раз большая за норму», — сказаў спадар Гануш.

Журналісты ўзгадалі пра праграму Нацыянальнага банка Беларусі па эканамічнаму пад'ёму Брагінскага раёна. Што здарылася з гэтай праграмай?

«Пакуль банк нічога не даў. Нават Сусветны банк даваў грошы на газіфікацыю раёна, гэта было яшчэ два гады таму. Праводзіліся абследаванні жылых дамоў у населеных пунктах Мікулічы і іншых, людзі ўжо былі задаволены, а ў выніку ніхто нічога не даў. Нават калі грошы і паступяць ад Сусветнага банка ці іншага, сюды яны ніколі не прыйдуць. Напрыклад, калі шматдзетная сям'я будуе дом. Нехта думае, што галава сям'і пакладзе гэтыя грошы ў кішэню. Не, гаспадар гэтых грошай не ўбачыць. Ён толькі падпісвае акт аб прыёмцы выкананых работ, банк праплочвае, і на гэтым усё — гаспадар нават не бачыць гэтых грошай. Так робяць і ўсе нашы астатнія банкі. Сапраўды, была прыгожая праграма, але яна не дайшла да канца. Тым больш, калі сёння паўсюдна крызіс», — рэзюмаваў Валянцін Гануш.

З НАГОДЫ

# НА БАЦЬКОЎСКІХ ПАДВОРКАХ

Вольга ХВОІН

**Чым бліжэй да чарнобыльскай зоны, тым менш сустракаецца людзей. Вёскі тут невялікія, раскіданыя адна ад адной далёка. Быццам бы знаёмая, прыветная Беларусь, але адчуванне забытасці і запусцення мяккай хадой крочыць следам: зыркне з вакна закінутай хаты, сіратліва паглядзіць з разбітага сямейнага партрэта. Зямля, ад якой адракліся ўсе, акрамя тых, хто на ёй нарадзіўся і родную хату вызнаў мілейшай за даброты разнастайных дзяржаўных праграм.**



У шэрагу вёсак Брагінскага і Хойніцкага раёнаў, што былі адселены пасля аварыі на ЧАЭС, да гэтага часу жывуць людзі. Назбіраецца іх, упартых, некалькі дзесяткаў, не больш. Нічога асаблівага не просяць, на жыццё сваё, далёкае ад прывычных нам дабротаў цывілізацыі, не скардзяцца. Хіба толькі на прамілы бог моляць не чапаць іх, даць магчымасць спакойна дажыць свой век на бацькоўскіх падворках.

Беларусь — краіна цыдулак і інструкцый. Правіла «што напісана пяром...» дзейнічае тут напоўніцу. Вёску Губарэвічы Хойніцкага раёна калісьці даўно пачалі адсяляць, бо знаходзіцца яна на забруджанай тэрыторыі. Але засталося колькі старых, якія вырашылі адсюль нікуды не з'язджаць. Пакінуць бы іх у спакоі, дык не — на паперцы не сышліся статыстычныя звесткі, і цяпер Губарэвічам пагражае прымусовае высяленне. Хаця ў Стрэлічаве — цэнтральнай вясковай сядзібе, якая знаходзіцца за паўтара кіламетры, — тыя ж мясцовыя ўлады спрабуюць наладзіць жыццё. Абрабляюцца палеткі, працуе спіртзавод, маладым будуюць жыллё.

У Губарэвічах дамы і падмуркі, што ад іх засталіся, паціху закопваюць у зямлю. Цяпер тут працуе тэхніка спецыялізаванага прадпрыемства «Палессе». Вартуе яе Надзея Зорына, мясцовая жыхарка, хата якой, фактычна, у чарзе на руйнаванне. «Колькі нам засталося? Два-тры гады — і памром ужо, чаго выганяць?! — апелюе да ўладаў жанчына. — У нас у раёне адны бабы засталіся, а мужыкоў няма... Райвыканкам цісне на сельсавет, а сельсавет на нас — «давайце высяляйцеся». Я не баюся, у мяне кватэра ёсць, усё забяру, вокны заб'ю... Але яны не маюць права хату раскідаць, хай стаіць, можа, мой сын з Чукоткі прыедзе і ферму тут развядзе». Ехаць жыць да дзяцей, па словах, спадарыні Надзеі, няма сэнсу: «Былі дзеці, а ў дзяцей цяпер дзеці — унучаняты. І будзе: «Куды сеў дзед? Куды налёпаў». Каму яно трэба? А мне жалка, я тут радзілася, усё знаю — гэта даваеннае, а гэта пасляваеннае...»

Цяпер у вёсцы засталося восем двароў, некалі было 250. Усе пенсіянеры, некаторыя дагэтуль працуюць. 79-гадовы Міхаіл Рудзянок — па кантракту кіроўцам у КСУП «Стралічава». Гаворыць, што раней скардзіліся на прымусовае высяленне, дык быццам бы і далі ім жыць тут, а з вясны зноў пачалося па-новаму. «Гадоў дваццаць таму нас высялялі, дык цяпер апелююць да таго, што нам выдалі жыллё. Мая жонка з'ехала туды з дзецьмі, памерла там... Куды цяпер ехаць? Няма нам прыюту, куды ехаць, абсалютна».

Марыі Дашук 79 гадоў, 65 з іх адпрацавала ў калгасе. У цяперашнім дамку жыве без прапіскі: раней жыла на ўскрайку вёскі, а пасля перабралася ў пустую хату бліжэй да цэнтра, бо страшна было жыць наводшыбе, ды і злодзеі наведваюцца пачалі. За старую хату дзяржава сплаціла жанчыне сем мільёнаў рублёў, але новага жылля за такія грошы не купіш. Дый няма жадання ў кабеты некуды ехаць. Двойчы пісала кіраўніку дзяржавы пра сваю бяду, каб разабраўся. Ліст спусцілі ў Хойніцкі выканкам — і выніку ніякага.

Старыя ў кожным, хто цікавіцца іх жыццём, бачаць магчымага выратавальніка. Расказваюць, просяць... каб улады пакінулі іх у спакоі.

*На ровары ў суправаджэнні двух жвавых цуцыкаў едзе дзядзька. Немаладыя ўжо, на працу вартаваць пілараму ды іншае саўгаснае дабро. Без асаблівай скрухі расказвае пра сваё жыццё, заробак у 240 тысяч рублёў, адмененыя «чарнобыльскія» льготы, з якімі раней «ого, як было лягчэй». І, можа, няпроста яму тут, але іншае жыццё — яно чужое і ўжо наўрад зрасцецца. Відаць, таму ва ўсіх чарнобыльскіх вёсках спяшаюцца распавесці пра перасяленцаў, якія адышлі ў лепшы свет, супрацьпастаўляючы гэтаму цуд сваёй жыццёвай сілы на бруднай, але роднай зямлі.*

МЫТНЯ

# САЮЗ ЧАРГОВЫ ШТО РЫХТУЕ?

Марыя КРУК

**З новага года пачне дзейнічаць Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана. А з 1 ліпеня 2010 года, калі ўступіць у сілу адзіны Мытны кодэкс, усе формы кантролю будуць вынесены на знешнія межы Беларусі, Расіі і Казахстана.**




Усе працэдуры па афармленні адзінай мытнай прасторы з удзелам трох краін завершацца да ліпеня 2011 года. Агульную палітыку ў тарыфнай сферы пачне праводзіць камісія Мытнага саюза, рашэнні якой стануць абавязковымі для трох бакоў. Стаўкі мытных пошлін будуць змяняцца толькі па дамове трох бакоў, але голас Расіі будзе вырашальным: ёй у камісіі належаць 57 працэнтаў галасоў, у Беларусі і Казахстана — па 21,5 працэнта.

Трыма дзяржавамі ўжо ўзгоднены адзіны мытны тарыф і зацверджаныя дырэктывы для адзінай перагаворнай групы па ўступленні Расіі, Беларусі і Казахстана ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА) — з кастрычніка ўдзельнікі Мытнага саюза плануюць аднавіць перамовы з СГА. Пры гэтым краіны мусяць спыніць двухбаковыя перамовы з СГА, якія працягваюцца больш за дзесяць гадоў. Расія і Беларусь спрабуюць далучыцца да СГА ад 1995 года, а Казахстан — ад 1996-га.

Адкрытыя мытныя межы прынясуць Беларусі як прыбыткі, так і страты. З пазітыўных вынікаў: айчынныя прадпрыемствы змогуць рэалізоўваць больш прадукцыі, мытныя пошліны на шэраг тавараў могуць знізіцца, у выніку завозную іх будзе танней, што добра і для пакупнікоў, бо знізяцца цэны. Аднак адсутнасць бар'ераў на мяжы можа справаваць і шквал «шэрага» імпарту, а беларускім прадпрыемствам давядзецца засвойваць працу ў новых канкурэнтных умовах, якія не кожнае зможа вытрымаць.

Найбольш пытанняў пакуль узнікае па гарманізацыі мытных пошлін на ўвоз аўтамабіляў. У Расіі пошліны значна вышэй, калі беларускія паднімуцца да іх узроўню, гэта прывядзе да росту коштаў на ўнутраным аўтарынку і экспансіі іншамарак, сабраных у Расіі. Як заявіў кіраўнік Мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі, увядзенне пошлін на імпартныя легкавыя аўтамабілі ў Беларусі знаходзіцца «хутчэй у плоскасці палітыкі, чым эканомікі», аднак гэта не значыць, што «тарыфы абавязкова будуць падвышаныя, а не паніжаныя».

Пастаянны прадмет спрэчак паміж Расіяй і Беларуссю — вуглевадароды і іх вытворныя. Нядаўна Беларусь прапанавала Расіі не дзяліць пошліны на нафту ў Мытным саюзе. Дамова паміж Беларуссю і Расіяй аб мытных пошлінах на нафту і нафтапрадукты была падпісана ў 2007 годзе. Тэрмін яе дзеяння завяршаецца сёлета.

«Беларускі бок лічыць, што дзяліць пошліну на нафту — няправільна, таму што і раней Беларусь і Расія фактычна працавалі ва ўмовах Мытнага саюза. Зараз, калі гэты працэс узмацняецца, ствараецца Мытны саюз на траіх, навошта вырываць з гэтага пераліку адну нафту і спаганяць увазную мыту на яе, — лічыць першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. — Больш разумна і рацыянальна дзяліць экспартную пошліну на нафтапрадукты». Эксперты лічаць, што адмена мытнай пошліны Беларусі выгодная, бо ў такім разе яна не будзе авансам аплачваць пастаўку расійскай нафты. Што тычыцца размеркавання экспартнай пошліны на нафтапрадукты, то пакуль прапанаваны варыянт падзелу паміж РФ і РБ у прапорцыі 85 і 15 працэнтаў адпаведна.

Што тычыцца шараговых прадпрыемстваў, то іх кіраўніцтва пакуль знаходзіцца ў непаразуменні. Да ўвядзення новых правілаў гандлю засталося не так многа часу, а неабходнай інфармацыі вобмаль. Як перадае інтэрнэт-рэсурс *naviny.by*, старшыня кіравання Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў ім. Куняўскага (БСПН), экс-міністр эканомікі Георгій Цэбараў лічыць, што беларускім прадпрыемствам будзе складаней канкураваць з расійскімі з-за розных коштаў на газ для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін. Невядома таксама, ці захаваюцца квоты на пастаўкі беларускіх тавараў у Расію, практыка выдачы індывідуальных праферэнцый прадпрыемствам ды шэраг іншых пытанняў.

За восем месяцаў бягучага года аб'ём знешняга гандлю таварамі ў Беларусі ў склаў 30,7 мільярда долараў ЗША. У жніўні аб'ём знешняга гандлю ў параўнанні са студзенем гэтага года ўзрос на 35,5 працэнта.

РЭЙТЫНГ

# ЭМІГРАНЦКІЯ РЭЗЕРВЫ

Вольга ХВОІН

**Беларусь узнялася на адзін пункт у рэйтынгу індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу (ІРЧП) — з 69-га на 68-е месца. Рэйтынг склала Праграма развіцця ААН у рамках даклада ААН «Праблема бар'ераў: чалавечая мабільнасць і развіццё». За аснову прымаліся статыстычныя звесткі за 2007 год са 182 краін свету.**

Індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу — гэта абагульнены паказчык узроўню дабрабыту людзей. Ён уключае індыкатары чаканай працягласці жыцця насельніцтва, доступу да адукацыі і долі валавога ўнутранага прадукту на душу насельніцтва. Кіраўнік Прадстаўніцтва ААН у Беларусі Антоніус Брук адзначыў, што месца Беларусі ў рэйтынгу — гэта вынік 15-гадовага прагрэсу ў краіне. Эксперт звярнуў увагу на амаль 100-працэнтную пісьменнасць дарослага насельніцтва краіны, адносна гендэрную роўнасць (тут ён прывёў прыклад беларускага парламента, дзе кожны трэці дэпутат — жанчына), а таксама чаканую працягласць жыцця нашых суайчыннікаў, якая складае 69 гадоў.

Падобныя рэйтынгі даюць уяўленне не толькі наконт пазіцыі, якую займае краіна ў адносінах да іншых, але і пра дынаміку развіцця. Паводле рэйтынгу ІРЧП, усе краіны падзяляюцца на чатыры групы: краіны з вельмі высокім узроўнем развіцця, краіны з высокім узроўнем развіцця, краіны з сярэднім узроўнем развіцця і краіны з нізкім узроўнем развіцця. Беларусь увасходзіць у другую групу разам са сваімі суседкамі — Літвой (46-е месца), Латвіяй (48-е месца), Польшчай (41-е месца), Расіяй (71-е месца). Украіна адносіцца да краін з сярэднім ІРЧП і займае 85-е месца. Узначальвае рэйтынг Нарвегія, за ёй ідуць Аўстралія і Ісландыя. Гэтыя краіны адносяцца да краін з вельмі высокім узроўнем індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу.

Дарэчы, у 1990 годзе Беларусь займала 40-е месца ў рэйтынгу ІРЧП, далей назіралася паступовае падзенне, і летась краіна была на 64-м месцы.

Што тычыцца тэматычнага складніку даклада — міграцыйнай праблемы, то яго аўтары сцвярджаюць, што «ў дакладзе развейваюцца многія міфы, звязаныя з міграцыяй». Напрыклад, тое, што мігранты крадуць працоўныя месцы і жывуць за кошт падаткаплацельшчыкаў. «Гэта насамрэч не так. Давайце ўспомнім Аляксандра Рыбака, які перамог у Еўрабачанні і з'яўляецца самым знакамітым эмігрантам з Беларусі ў Нарвегіі», — заўважыў падчас прэзентацыі дакладу кіраўнік Прадстаўніцтва ААН у Беларусі Антоніус Брук.

Факты, прадстаўленыя ў дакладзе, паказваюць, што большасць мігрантаў не перасякае міжнародныя межы, а мяняе месца жыхарства ўнутры ўласнай краіны. Колькасць унутраных мігрантаў у свеце складае каля 740 мільёнаў чалавек, гэта амаль у чатыры разы больш за колькасць міжнародных мігрантаў. Сярод апошніх 30 працэнтаў пераязджаюць з краін, што развіваюцца, у развітыя.

Мігранты звычайна садзейнічаюць росту вытворчасці і аддаюць больш, чым атрымліваюць. Міграцыя, як правіла, павышае занятасць у рэгіёне, які прымае, садзейнічае інвестыцыям у новыя прадпрыемствы і праграмы. Аднак і мігранты могуць нямала атрымаць пасля перамены месца жыхарства. Даход мігрантаў з больш бедных краін, пасля іх пераезду ў развітую краіну, у сярэднім у 15 разоў вышэйшы, чым на радзіме, паказчык ахопу дзяцей школьнай адукацыяй удвая вышэйшы, а дзіцячая смяротнасць у 16 разоў ніжэй.




Разам з тым аўтары дакладу папярэджваюць, што міграцыя не з'яўляецца заменай развіццю, хаця і можа зрабіць пазітыўны ўнёсак у аздараўленне эканомікі ў час крызісу. Антоніус Брук лічыць, што крызіс сур'ёзна паўплывае на эканамічную сітуацыю ва ўсіх краінах свету, асабліва з нізкім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу. Таму ўсе краіны, у тым ліку і Беларусь, павінны падвоіць свае намаганні ў правядзенні эканамічных рэформ. Для краін СНД міграцыя з'яўляецца станоўчай з'явай, бо ў гэтым рэгіёне назіраецца паніжэнне долі працаздольнага насельніцтва, а імігранты — гэта маладыя і адукаваныя работнікі.

Паводле высноваў аналізу статыстычных дадзеных, міграцыя ў краінах постсавецкай прасторы за апошнія два дзесяцігоддзі знізілася, за выключэннем Расіі, якая з'яўляецца своеасаблівым магнітам у рэгіёне.

У Беларусі плынь мігрантаў за апошнія гады павялічылася. Летась у краіну ўехалі 17 500 мігрантаў, а два гады таму — 14 тысяч чалавек, пры гэтым з краіны выехалі толькі 8 тысяч чалавек. Прыблізна палова з тых, хто абраў Беларусь сваім новым домам, прасілі тут палітычнага прытулку. Начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Аляксей Бегун адзначыў, што ў краіне традыцыйна назіраецца станоўчае сальда міграцыі і колькасць працоўных мігрантаў, якія ўязджаюць у Беларусь, на 50 працэнтаў перавышае колькасць беларусаў, што выязджаюць на працу за мяжу. Унутры краіны штогод месца жыхарства мяняюць каля 300 тысяч чалавек. Асноўная плынь мігрантаў накіраваная з сельскай мясцовасці ў горад.

Што тычыцца нелегальнай міграцыі, то гэта міграцыйная плынь, па словах Аляксея Бегуна, цяпер не ўяўляе небяспекі для Беларусі. Сёлета супрацоўнікамі Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў былі затрыманыя 33 нелегальных эмігранты, крыху большая лічба ў Дзяржаўнага памежнага камітэта, у той час як у 2001 годзе гэты паказчык перавышаў дзве тысячы чалавек.

Паводле афіцыйнай статыстыкі, за восем месяцаў бягучага года ў краіну ўехалі 12 754 чалавекі, выехалі — 4 997 чалавек.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 14 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы.
**09.15** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія).
**10.10** Меладрама «Сёстры па крыві».
**11.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-2» (ЗША).
**13.55** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы U-21. Беларусь - Албанія. Прамая трансляцыя.
**16.05, 19.20** Навіны рэгіёна.
**16.15** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія).
**17.05** Меладрама «Сёстры па крыві».
**18.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.50** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). Закл. серыя.
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Алімпійскі часопіс.
**21.55** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату свету. Англія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Шматсерыйны фільм «Я вярнуся».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня», 2004 г.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Я вярнуся». Заключная серыя.
**22.10** Прэм'ера АНТ. «Браты-дэтэктывы». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.30** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Спецназ». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Трэцяга не дадзена». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.55** Прэм'ера! «Паляванне на Вервольфа». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.55** «Спецназ». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** У гэты дзень.
**08.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Гераіка-прыгодніцкі фільм «Зялёны фургон». (СССР). 1-я серыя.
**11.50** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**13.20** Спорт-кадр.
**13.45** Мультфільм.
**13.55** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.40** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Лабірынты: Чарэя Сапегаў».
**15.40** Медычныя таямніцы.
**16.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ». 3-я серыя.
**17.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Гераіка-прыгодніцкі фільм «Зялёны фургон». (СССР). 2-я серыя.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Беларуская часіна.
**21.55** Іншыя. «Капкан для Папялушкі».
**22.25** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**22.55** Дэтэктыўны серыял «На рагу ля Патрыяршых-2» (Расія). 2-я серыя.
**23.50** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Беларусь- Італія.
**01.20** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя). 3-я серыя.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Здрадзіць праўдзе. Гісторыя звяржэння Хрушчова». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Пелагія і белы бульдог».
**13.05** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Гарадок». Дайджэст.
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Пелагія і белы бульдог».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Пра што маўчаў баечнік? Яўген Шварц». Дакументальны фільм.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Выратавальнікі».
**09.15** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Дачны адказ».
**12.10** Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
**21.50** Крымінальны серыял «Час Волкава».
**23.00** Сёння.
**23.25** «І зноў добры дзень!».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».

EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**09.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Партугалія - Венгрыя.
**10.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**11.30** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Фінал.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**15.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**17.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Расія - Германія.
**18.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**19.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Сербія - Румынія.
**19.40** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.05** Абранае па серадах.
**20.10** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Осла.
**21.10** Навіны коннага спорту.
**21.15** Гольф. Тур PGA. Кубак прэзідэнта. Агляд.
**22.15** Гольф. Еўратур. Мастэрс (Іспанія).
**22.45** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**22.50** Ветразны спорт. Кубак Maxi Yacht Rolex. Порта Серва (Італія).
**23.20** Ветразны спорт. Адкрыты чэмпіянат Даніі. Капенгаген (Данія).
**23.50** Яхт клуб. Навіны ветразнага спорту.
**23.55** Абранае па серадах.
**00.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Агляд.
**01.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**01.15** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Фінал.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** Праект «Будучыня».
**19.40** Форум (ток-шоу): «За калючым дротам. Ці мы гатовы да дэмакратыі?»
**20.35** «Новае жыццё», 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая».
**21.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.25** Сальда (эканамічная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 15 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.10-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Прэм'ера. Ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША). 3-я серыя.
**22.55** Прэм'ера. Драма «Пары» (Расія).
**00.40** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Шматсерыйны фільм «Я вярнуся». Заключная серыя.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Гісторыя аднаго змену, або Глабальнае пацяпленне».
**22.10** Прэм'ера АНТ. «Браты-дэтэктывы». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.25** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**09.00-15.00** Прафілактыка.
**15.00** «Калі мне было восем гадоў». Дакументальны фільм.
**15.30** «Паляванне на Вервольфа». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** Прэм'ера! «Паляванне на Вервольфа». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.55** «Спецназ». Серыял.

**Тэхнічная прафілактыка да 15.00**
**15.05** У гэты дзень.
**15.10** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**15.35** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя). 4-я серыя.
**16.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Спартак (Масква). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.15** Час футболу.
**22.45** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**23.20** Дэтэктыўны серыял «На рагу ля Патрыяршых-2» (Расія). 3-я серыя.
**00.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя). 4-я серыя.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.00-15.10** Прафілактыка.
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Пелагія і белы бульдог». Расія, 2009 г.
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Зорнае каханне Віталя Саломіна». Дакументальны фільм.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Барацьба за ўласнасць».
**09.15** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.05** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.05** Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
**21.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Час Волкава».
**22.45** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Галоўны герой прадстаўляе».
**00.15** «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенкі».
**00.45** «Позняя гутарка».

EUROSPORT

**09.35** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**11.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**12.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**13.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.
**13.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Боснія і Герцагавіна - Іспанія.
**14.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**15.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**17.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.
**18.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Боснія і Герцагавіна - Іспанія.
**19.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**20.25** «Формула-1». Часопіс.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Да-1. Фінал 16. Кваліфікацыя.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**02.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**02.15** Вось дык так!!!

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял.
**19.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял: «Made in Беларусь».
**20.40** Маю правы (прававая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.25** Рэпартэр (публіцыстычная праграма).
**22.50** Аб'ектыў.

## 16 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Серыял «Застава Жыліна» (Расія). 1-я серыя.
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві» (Расія-Украіна).
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Веронiка Марс-2» (ЗША).
**13.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.30** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Серыял «Застава Жыліна» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія). Заключная серыя.
**22.55** Камедыя «Крымінальнае чтыво» (ЗША).
**01.35** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Савелій Крамараў. Джэнтльмен удачы».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хвіліна славы».
**22.40** АНТ прадстаўляе: «Наша Беларуша».
**23.15** Фільм «Марыя і Брус».
**00.50** Нашы навіны.
**01.05-01.15** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Спецназ». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Паляванне на Вервольфа». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** КВЗ. Першая ліга. 1/2 Фіналу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Пажар на тэлевежы». Германія, 2007 г.
**01.55** «Уцёкі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** У гэты дзень.
**08.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** Жансавет.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.00** «Лепшыя песні». Канцэрт (Расія).
**13.05** Іншыя.
**13.35** Гаспадар.
**14.00** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**14.45** «Свая музыка. Працяг».
**15.15** Мультфільм.
**15.25** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ». 5-я серыя.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Гараджане.
**19.40** «Пра мастацтва».
**20.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.05** Калыханка.
**21.20** Бітва экстрасэнсаў.
**22.30** Прэм'ера. «Джазавыя імправізацыі на тэму: Алег Яфрэмаў». Дакументальны фільм (Расія).
**23.15** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Юнасць (Мінск) - Шыннік (Бабруйск).
**01.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя). 5-я серыя.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Пелагія і белы бульдог». Расія, 2009 г.
**13.05** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пакой смеху».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2009». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.10** Навіны - Беларусь.
**22.20** Прэм'ера. Канцэрт Мікалая Баскава.
**00.30** Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка!».
**02.15** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Кухары і кухцікі».
**09.10** «Масква-Ялта-транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.25** «Галоўны герой прадстаўляе».
**12.10** Вострасюжэтны дэтэктыў «Вуліцы пабітых ліхтароў-9».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Суперстар» прадстаўляе: «Я застаюся, каб жыць».
**23.50** Прэм'ера. Крымінальная драма «Аднойчы ў Марсэлі».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**09.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.
**10.30** «Формула-1». Часопіс.
**11.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**12.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**13.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. 1/2 фіналу. Александрыя (Егіпет).
**15.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Боснія і Герцагавіна - Іспанія.
**16.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.
**16.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**17.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**18.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Матч за 3-е месца. Александрыя (Егіпет).
**19.50** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Александрыя (Егіпет). Фінал.
**23.15** Боўлінг. Тур PBA. ЗША.
**00.15** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Fortissimus. Канада.
**01.15** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**01.40** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**20.00** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 2.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне) .
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кургана» (спазнаваўчая праграма).
**21.25** «Панна Ніхто», маст. фільм, Польшча.
**23.05** Аб'ектыў.

## 17 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Афрыка. Магічны кантынент» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Тэлесерыял «Вясковая камедыя» (Расія).
**10.35** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**11.10** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Насця» (Расія).
**13.55** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.20** «Алімпійскі часопіс».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**16.40** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.40** Відэафільм АТН «Ваўкавыскія пагоркі» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Канцэрт «Танчы да раніцы».
**21.00** Панарама.
**21.40** Камедыйная меладрама «Вікі Крысціна Барселона» (ЗША - Іспанія).
**23.30** «Уласная персонай».

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Прэм'ера. «Дыяментавая ручка караля камедыі».
**12.10** «Вялікая розніца».
**13.15** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** АНТ прадстаўляе: «Кінаметры вайны».
**14.20** «Радзіма або смерць». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Рэальны тата».
**18.00** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.55** «Ледніковы перыяд».Новы сезон.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд».Новы сезон. Працяг.
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?».
**00.50-02.35** Фільм «Маё першае вяселле».

**06.35** «Анфас».
**06.50** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**08.25** Фільм «Госця з будучыні». СССР, 1984 г. 3-я серыя.



**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** «Ваенная таямніца».
**15.00** Фільм «Саламяны капялюшык». СССР, 1974 г. 1-я серыя.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Top Gear. Руская версія».
**18.10** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «3 чаго пачынаецца Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.35** Фільм «Гадзіннік». ЗША-Вялікабрытанія, 2002 г.
**23.45** Фільм «Гуд бай, Ленін!». Германія, 2003 г.
**01.45** «Уцёкі». Серыял.

**07.20** Смачна з Барысам Бурдой.
**07.55** Усё аб бяспецы.
**08.20** «Джазавыя імправізацыі на тэму: Алег Яфрэмаў». Дакументальны фільм (Расія).
**09.00** Сямейная меладрама «Свая чужая сястра» (Расія).
**10.40** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**12.00** «Лабірынты: гаспадыня Марыя Патоцкая».
**12.25** «Запал па культуры».
**13.05** Фантастычная камедыя «Ніколі не размаўляйце з невядомымі» (Расія).
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Астан-Віла - Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**16.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Днепр» (Магілёў) - «Дынама» (Брэст). Прамая трансляцыя.
**19.05** «Юбілейны вечар Генадзя Хазанава». Канцэртная праграма (Расія).
**21.20** Меладрама «Парыж, я люблю цябе» (Францыя-Швейцарыя).
**23.40** Казанова.
**00.05** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Бразіліі. Кваліфікацыя.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Здабытак рэспублікі».
**07.40** «Нататкі натураліста».
**08.10** «Юрмала-2009». Фэст гумарыстычных праграм.
**09.40** «Ранішняя пошта».
**10.15** «Суботнік».
**11.00** Весткі.
**11.10** Пакой смеху.
**11.55** Канцэрт Мікалая Баскава.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Каменская».
**15.20** Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка!».
**17.20** Фільм «Небяспечны ўзрост».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.40** Фільм «Тармазны шлях». Расія, 2007 г.
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Рэпарцёр К. Гардзеева». Лепшыя фільмы.
**14.15** Прэм'ера. Крымінальная меладрама «Забойства ў дачны сезон».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Жаночы погляд».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Эксперты».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руския сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.10** Прэм'ера. Драматычны баявік «Бяспрэчны-2.
**00.50** Дэтэктыўны трылер «Ганібал».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Александрыя (Егіпет). Фінал.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**11.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР.
**12.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Боснія і Герцагавіна - Іспанія.
**13.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету. ПАР. Францыя - Аўстрыя.
**14.00** Снукер. Сусветная серыя. Прага (Чэхія). Дзень 1.
**16.00** Веласпорт. Тур Ламбардыі. Італія.
**18.30** Настольны тэніс. Кубак свету. 1/4 фіналу. Масква (Расія).
**20.00** Снукер. Сусветная серыя. Прага (Чэхія). Дзень 1.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**00.15** «Формула-1». Часопіс.
**00.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Да-1. Фінал 16. Кваліфікацыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** Аўтастопам праз Еўропу, 6 серыя: Мілан.
**19.35** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Расціслаў Смаленскі» (спазнавачая праграма).
**21.20** Суботні сеанс: «Сваты», маст. фільм, 2003 г., ЗША–Германія.
**22.55** Аб'ектыў.

ЦІКАВА

# ПАПА ЕДЗЕ Ў ЛОНДАН

Іван БІЧ

**Брытанская газета «The Times» са спасылкай на крыніцы ў Ватыкане паведаміла, што ў наступным годзе галава каталіцкай царквы збіраецца наведаць Лондан. Гэта будзе першы ў гісторыі афіцыйны візіт Папы ў Аб'яднанае Каралеўства.**



Увогуле, першым Рымскім Папам, які ступіў на зямлю Брытаніі, мог быць Ян Павел II. Яго візіт быў запланаваны яшчэ на 1982 год. Усё, здавалася б, было падрыхтавана: складзены графік сустрэч і маршрут па краіне. Аднак у самы апошні момант візіт адмянілі. Прычынай стала вайна Вялікабрытаніі з Аргенцінай з-за Фолклендскіх выспаў.

Да ідэі візіту Папы ў Вялікабрытанію вярнуліся толькі ў гэтым стагоддзі. Папярэдні кіраўнік ураду Тоні Блэр і цяперашні прэм'ер Гордан Браўн неаднаразова запрашалі галаву Рыму, аднак толькі зараз у яго з'явілася магчымасць адказаць на запрашэнне станоўча.

Чакаецца, што Бенедыкт XVI будзе гасцяваць у Вялікабрытаніі ў наступным жніўні. Візіт працягнецца тры дні.

Пра сімвалічнае значэнне гэтага візіту нават казаць няма сэнсу. Ён — перагорнутая старонка супрацьстаяння, якое пачалася ў далёкія часы рэфармацыі.

Як вядома, рымскі каталіцызм быў амаль тысячу гадоў вядучай царквой у Англіі (першая папская місія з'явілася тут у 597 годзе, а першая інфармацыя пра наяўнасць у Брытаніі хрысціянскай грамады датуецца ўвогуле пачаткам IV стагоддзя).

Усё было добра, пакуль у 1534 годзе кароль Генрых VIII не заявіў пра выхад мясцовай царквы з-пад кантролю Рыму. Гэта была помста за нежаданне Папы аформіць разрыў шлюбу манарха і Кацярыны Арагонскай. Адначасова была створана англіканская царква.

Увогуле, сам Генрых не быў заўзятым пратэстантам, аднак мусіў прыцягнуць прыхільнікаў рэфармацыі на свой бок для барацьбы з Рымам. Тыя спрабавалі навязаць сваю радыкальную дагматыку, аднак у выніку перамог кампраміс: англіканская царква захавала шмат каталіцкіх рытуалаў і царкоўных канонаў.

Нягледзячы на гэта, царкоўнае пытанне на доўгі час падзяліла краіну. Супрацьстаянне каталікоў і пратэстантаў было прычынай грамадзянскіх войнаў і нават Англійскай рэвалюцыі. Пераможцамі аказаліся пратэстанты. Гісторыкі лічаць, што гэтаму спрыяла тое, што ў часы каралявання Елізаветы (1588–1603) пратэстантызм стаў часткай нацыяналізму. Іспанія — тагачасны лідэр каталіцкага свету — абвясціла вайну Англіі, адным з матываў якой стала барацьба за правільную трактоўку Хрыста. Пагроза акупацыі спрыяла аб'яднанню нацыі вакол пратэстанцкай каралевы.

У сваю чаргу, улады атрымалі індульгенцыю на пераслед каталікоў. У часы Елізаветы ўсе каталіцкія біскупы былі абвешчаныя здраднікамі. Для арыстакратаў дзейнічала забарона на шлюбы з каталікамі. Да 1832 года каталіцызм у Англіі быў пад забаронай. Касцёл дзейнічаў у падполлі. А ў 1832 годзе каталіцызм легалізавалі спецыяльным актам. Рымская курыя магла мець свае структуры і дзейнічаць легальна.

Адносіны да Касцёлу змяніла Вялікая французская рэвалюцыя. Яе ахвяры беглі ў Вялікабрытанію, якая падтрымлівала стары рэжым. Паколькі лідэры рэвалюцыі былі заўзятымі праціўнікамі Касцёлу, каталікі аўтаматычна сталі саюзнікамі Лондану. На іх сходы і малітвы сталі глядзець больш лаяльна.

Канчатковую кропку паставіла ірландская эміграцыя (ірландцы, як вядома, каталікі). Вялікі неўраджай бульбы ў 1845 годзе ў Ірландыі выклікаў масавы голад і сыход людзей у Англію. У краіне ўзніклі каталіцкія камуны.

Больш таго, у другой палове XIX стагоддзя пачаўся своеасаблівы рэнесанс каталіцызму. Быць рымскім каталіком сярод інтэлігенцыі стала модна. Каталікамі былі такія вядомыя брытанцы, як рэжысёр Альфрэд Хічкок, пісьменнік і вучоны Дж. Р.Р. Толкіен.

Зараз у Вялікабрытаніі пражываюць 4,2 мільёна каталікоў, або 8 працэнтаў насельніцтва. Цікава, што ў 1901 годзе было толькі 4,8 працэнта. Найбольшая колькасць каталікоў (47 працэнтаў) жыве ў Ліверпулі, дзе шмат эмігрантаў з Ірландыі.

Асобна трэба казаць пра польскіх каталікоў. Пасля вайны брытанскі ўрад дазволіў салдатам арміі Андэрса застацца ў краіне. У выніку тут аказалася 250 тысяч палякаў. У брытанскі касцёл яны хадзілі неахвотна, таму стварылі свае аўтаномныя прыходы. Пасля таго, як Польшча стала сябрам ЕС, а яе грамадзяне атрымалі права працаваць ва ўсіх краінах Еўрасаюза, Вялікабрытанія перажыла другую хвалю польскай эміграцыі. Адпаведна, польскі касцёл узмацніў тут свае пазіцыі.

Натуральна, кожны візіт Папы — гэта вялікая палітыка. Прэса піша, што такі візіт дадасць папулярнасці палітыку, які праз год будзе гаспадаром на Даўнінг-стрыт, 10. Пытанне, хто ім будзе — цяперашні лейбарыст Гордан Браўн ці кансерватар Дэвід Кэмеран? Эксперты прагназуюць, што выбары адбудуцца ў чэрвені наступнага года.

Таксама цікава, які рэзананс будзе мець візіт Папы ў Паўночнай Ірландыі, дзе кожны другі каталік. Папа, аднак, не наведае Белфаст, каб не справакаваць напружанасць паміж каталікамі і мясцовымі пратэстантамі. Аднак экстрэмісты з лагеру аранжыстаў (радыкальных пратэстантаў), відавочна, будуць ладзіць антыпапскія акцыі.

І не толькі яны. National Secular Society — вядучае брытанскае выданне атэістаў, праціўнікаў дыктату царквы ў грамадстве — ужо заклікала ўсіх сваіх прыхільнікаў падчас будучага візіту Папы выйсці на вуліцы і давесці, што не ўсе брытанцы ў захапленні ад рэлігіі.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

За мінулы год беларускім урадам быў зроблены шэраг крокаў з пазітыўным сігналам. На вельмі высокім узроўні неаднаразова сцвярджалася, што на гэтым не будзе пастаўлена кропка. З пункту гледжання ЕС падобныя абяцанні яшчэ не ў дастатковай ступені выкананы. Пачаўся працэс пэўнага расчаравання. ЕС, безумоўна, падтрымае Беларусь, калі рэформы будуць працягнуты. Вырашальнае значэнне пры гэтым будзе мець гатоўнасць Беларусі сапраўды выконваць розныя неабходныя «хатнія заданні» па мадэрнізацыі і рэфармаванню краіны... Калі гэта адбудзецца, то крэдыты еўрапейскіх фінансавых інстытутаў пойдуць услед за гэтым амаль аўтаматычна.

**«Reuter» (Вялікабрытанія)**

Ва ўмовах аўтарытарнага прэсінгу, калі тэма геяў выкарыстоўваецца Лукашэнкам для «кампраметацыі» дэмакратаў у вачах гамафобных мас, ад дэмакратаў і праваабаронцаў патрабуецца вялікая палітычная мужнасць, каб выступаць з талерантных пазіцый падтрымкі гомасексуалістаў. Засылаць на мітынгі апазіцыі пафарбаваных мужчынаў, каб затым Бацька распавядаў па тэлебачанні пра «блакітны» колер яго крытыкаў, ёсць універсальны і знаёмы прыём не толькі беларускіх спецслужбаў. Але тым дзіўней, што менавіта мінскія апазіцыйныя палітыкі аказаліся ў гэтых умовах (мяркуючы па прадстаўніцтву ў зале) больш мужнымі за расійскіх калегаў з ліку «дэмакратаў». Іх на канферэнцыі (Мінская канферэнцыя па праблемах сексуальных меншасцяў 26.09.09) было нашмат больш, чым магла б сабраць аналагічная маскоўская сустрэча.

**«Gayrussia» (Расія)**

Захад пляскае ў далоні, калі Расія і Беларусь спрабуюць душыць адна адну. Аднак Захаду наўрад ці быў бы выгодны варыянт, пры якім Расія перастала б даваць Беларусі грошы. Гэта цукерка Еўропе цяпер не па кішэні з-за эканамічнага становішча. Таму нічога катастрафічнага ў цяперашняй сітуацыі пакуль няма. Хутчэй, у тым, што адбываецца, бачыцца працяг летняй палемікі, якая рэцыдывам выявілася на глебе таго, што перагаворны працэс не ідзе.

**«РБК» (Расія)**

Першае, што відавочна — Лукашэнка апошнім часам знаходзіцца ў істэрычным стане, кідаючыся то ад Расіі ў бок Еўрасаюза, то зноў у бок Расіі. Можна гэта прааналізаваць падрабязна, але не мае сэнсу марнаваць час: Бацька то падлізваецца да Захаду і крытыкуе РФ, то ўдзельнічае ў ваенных перамовах, то тэлефануе, то «кідае слухаўку». Калі палітык узроўню прэзідэнта еўрапейскай краіны распавядае пра тое, як ён «кідае слухаўку» падчас гутаркі з Пуціным, гэта азначае, што ён не бачыць сваіх палітычных перспектыў у будучыні (ці перспектыў свайго суразмоўцы). Адсюль выснова — Аляксандр Лукашэнка ведае ці бачыць тое, чаго не бачым ці не ведаем мы з вамі. Напрыклад, яму паведамілі, што дні Уладзіміра Пуціна ў рангу нацыянальнага лідэра і на пасадзе прэм'ера палічаны. Ці яму намякнулі, што прэзідэнт Мядзведзяў чакае ад яго дапамогі ў «барацьбе» з «канкурэнтам» на хуткіх выбарах у 2012 годзе.

**«Комментарии» (Расія)**

Чым больш дрымучая краіна, тым больш шанцаў у сына правадыра самому стаць правадыром. У Аляксандра Лукашэнкі, напрыклад, адзін сын — дарадчык прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы, а самы малодшы, пяцігадовы, прымае разам з бацькам парады і ваенныя вучэнні. Зразумела, высокапастаўленае дзіця стамілася ад гульняў дарослых вакол яго, што прадэманстравала на мінулым тыдні і нашаму прэзідэнту.

**«Огонек» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. РАБЕСП'ЕР ТРАПІЎ У ЧОРНЫ СПІС

Парыжскі савет прыняў даволі сімвалічнае рашэнне: невялікай большасцю галасоў ён выступіў супраць таго, каб адна з вуліц Парыжа насіла імя Максімільяна Рабесп'ера. Рабесп'ер — адзін з герояў Вялікай французскай рэвалюцыі, аднак адначасова ён быў ініцыятарам рэпрэсій супраць яе праціўнікаў. Рэпрэсіі, праўда, дастаткова сціплыя ў параўнанні з тэрорам Сталіна або Мао (Рабесп'ер адправіў на гільяціну прыкладна тры тысячы чалавек), аднак на тыя часы гэта была грандыёзная лічба. Так ці інакш, для гісторыкаў рашэнне савета стала вельмі важным. Фактычна, яно — спроба дасягнення еўрапейскага адзінства па пытанню пераследу грамадзян з боку дзяржавы па палітычных матывах. Іншымі словамі, нават тэрор у імя правоў чалавека цяпер трактуецца як злачынства. Гэта, дарэчы, прызнаюць нават левыя, якія маюць большасць у парыжскім заканадаўчым органе.

**Па матэрыялах «Figaro» (Францыя)**

### ТАДЖЫКІСТАН. БЫВАЙ, «ВЕЛИКИЙ И МОГУЧИЙ»

Новы Закон пра мову прыняты абедзвюма палатамі парламента Таджыкістана. Паводле яго, зараз кожны грамадзянін краіны «абавязаны ведаць» таджыкскую мову, якая мае статус дзяржаўнай. Грамадзяне і арганізацыі абавязаны весці перапіску з органамі ўлады і мясцовага самакіравання толькі на таджыкскай мове. У той жа час руская мова перастала па закону быць мовай міжнацыянальных зносін. Дэпутаты кажуць, што наяўнасць такога пункту, як «мова міжнацыянальных зносін», не пасуе патрабаванням незалежнай дзяржавы. Першай ахвярай новага закону, відавочна, стане не рускамоўная меншасць (рускіх тут усяго прыкладна 60 тысяч на 7 мільёнаў таджыкаў), а моладзь, якая з-за адсутнасці працы едзе на будоўлі ў Расію. Слабае веданне мовы, натуральна, пагоршыць іх магчымасць абараняць свае правы. Аднак больш за ўсё дастанецца этнічным узбекам. Яны складаюць чвэрць насельніцтва Таджыкістана.

**Па матэрыялах узбекскай прэсы**

### ТУРЦЫЯ. АСМАНСКАЯ ІМПЕРЫЯ ІСНУЕ І СЁННЯ

Стамбульскім школьнікам раздалі мультымедыйныя навучальныя дапаможнікі, у якіх на карце Турцыі апынуліся краіны або часткі тых краін, якія калісьці ўваходзілі ў склад Асманскай імперыі. У прыватнасці, маюцца на ўвазе Балгарыя, частка Грэцыі, Крыт з часткай Іанічных выспаў, якія таксама належаць Грэцыі, і вялікі кавалак Азербайджана. Кампакт-дыск быў падрыхтаваны ў рамках нацыянальнай адукацыйнай праграмы, пачатай міністэрствам адукацыі. У рамках гэтай праграмы ўлады раздаюць бясплатныя навучальныя матэрыялы і арганізоўваюць для бацькоў школьнікаў адмысловыя мерапрыемствы. У міністэрстве адукацыі Стамбула папрасілі прабачэнне за карту і заявілі, што не ведаюць, адкуль яна з'явілася. Усю адказнасць службоўцы ўсклалі на нейкі аддзел дэпартамента адукацыі. Дарэчы, практыка выпуску карт, у якіх уключаюцца тэрыторыі той ці іншай дзяржавы, — не навіна. У Японіі малююць карты з Курыльскімі выспамі і Паўднёвым Сахалінам, у Румыніі — з украінскай Букавінай, фіны прымалёўваюць сабе Выбарг.

**Па матэрыялах турэцкай прэсы**

### ІРЛАНДЫЯ. АДЗІНСТВА АДКЛАДАЕЦЦА

Перамога прыхільнікаў так званага Лісабонскага праекту канстытуцыі ЕС пахавала, як піша брытанская прэса, адну з самых вялікіх мараў ірландскіх нацыяналістаў. У пачатку гэтага стагоддзя яны паставілі перад сабой грандыёзную задачу — аб'яднаць Паўночную Ірландыю (цяпер частка Вялікабрытаніі) і Ірландскую Рэспубліку ў адну краіну. Тэрмін выканання — сакавік 2016 года, калі спаўняецца сто гадоў вялікай падзеі ў гісторыі краю. У сакавіку 1916-га група ірландскіх нацыяналістаў, не маючы ніякага шансу на перамогу, захапіла цэнтр Дубліна і абвясціла пра незалежнасць ад Лондану. Бунт, натуральна, быў падаўлены, аднак ён даў моцны штуршок працэсу нацыянальнага і палітычнага адраджэння, які ў выніку прывёў да адраджэння ірландскай дзяржаўнасці. Аднак вынікі рэферэндуму ставяць крыж на гэтых планах. Большасць ірландцаў выступаюць за развіццё сувязяў з краінамі ЕС, бо бачаць у ім рэцэпт ад эканамічнага крызісу.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### РАСІЯ. ЭКСТРЭМІСТ МАКСІМ ГОРКІ

Праваабаронцы кубанскага горада Новарасійск звярнуліся да абласной пракуратуры з незвычайнай прапановай: прызнаць п'есу Максіма Горкага «Мяшчане» экстрэмісцкай і канфіскаваць яе са школьных бібліятэк. Раней пракуратура прапанавала суду забараніць адну з мясцовых арганізацый праваабаронцаў за тое, што яе актывісты выйшлі на пікет з транспарантам: «Правы не даюць, іх бяруць». Пракурор палічыў тэкст экстрэмісцкім. Між тым, гэта фраза — цытата з п'есы Горкага «Мяшчане». Грамадзянскія актывісты жартам прапануюць органам давесці справу да лагічнага фіналу: забараніць аўтара гэтых слоў. Тым больш, што ў «Мяшчанах» Горкі куды больш радыкальны. «Чалавек павінен заваёўваць правы, калі не хоча быць раздаўленым абавязкамі», — кажа адзін з персанажаў «Мяшчан».

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

ФЕМІДА

# ХІМІЯ СУПРАЦЬ ВЫЧВАРЭНЦАЎ

*Алег ПЯТРОЎ*



**У крымінальныя кодэксы краін-суседак імкліва ўваходзіць новы юрыдычны тэрмін — «хімічная кастрацыя». Лічыцца, што гэта самы эфектыўны сродак у барацьбе грамадства з педафіламі.**

25 верасня падобны закон быў прыняты ў Польшчы, цяпер яго разглядаюць у Францыі. На мінулым тыдні законапраект пра кастрацыю быў вынесены на разгляд расійскай думы. Што такое хімічная кастрацыя?



Як лічаць гісторыкі, кастрацыя (аперацыя па выдаленню палавых залоз у жывёл або чалавека) — адна з першых вядомых чалавецтву хірургічных аперацый. Практыка кастрацыі была шырока распаўсюджана ў Еўропе ў эпоху сярэднявечча, у мусульманскіх краінах і Кітаі. У адной толькі Італіі штогод кастрыравалі 4–5 тысяч хлопчыкаў ва ўзросце 7–12 гадоў.

Адначасова кастрацыя ўжывалася як сродак катавання або пакарання. Пачнём з таго, што некаторыя плямёны лічылі, што кастрацыя мужчынскай часткі варожага племені — лепшая гарантыя таго, што праціўнік не зможа ўзяць рэванш. Летапісы згадваюць, што Тамерлан загадаў пазбавіць генеталій усіх палонных армянскіх воінаў. Як ні жудасна гучыць, рэцыдывы сустракаюцца і сёння. У 2005 годзе ў Паўднёвым Судане былі выяўленыя выпадкі, калі суданскія ваенныя кастрыравалі мужчын, якія знаходзіліся ў зоне дзеяння паўстанцаў.

Таксама каралі кастрацыяй за канкрэтныя злачынствы ў рамках існуючага заканадаўства. Так, у старажытным Рыме кастрацыі падлягалі тыя, хто ўчыніў злачынства супраць імператара.

Здаецца, самым славутым кастратам Сярэднявечнай Еўропы быў філосаф П'ер Абеляр. Яго кастрыравалі родзічы каханкі, якія не жадалі развіцця раману. У 1778 годзе Томас Джэферсан, будучы прэзідэнт ЗША, стаў аўтарам закону штата Вірджынія, адпаведна якому акт садаміі караўся кастрацыяй яго ўдзельнікаў.

Менавіта як форма барацьбы з сексуальнымі злачынцамі кастрацыя дажыла да XX стагоддзя. Паралельна ёй актыўна ўжывалася стэрылізацыя тых, ад каго грамадства не хацела мець нашчадкаў (антысацыяльныя элементы, псіхічна хворыя і г.д.).

Прыкладна 80 гадоў таму вучоныя знайшлі больш цывілізаваны сродак пазбавіць чалавека палавых функцый. Былі знойдзены прэпараты, сістэматычнае ўжыванне якіх прыводзіла да поўнай імпатэнцыі. Сутнасць хімічнай кастрацыі ў тым, што ў арганізме змяншаецца ўзровень тэстастэрону і іншых гармонаў, якія выклікаюць палавую агрэсію.

Шматлікія краіны паступова пачалі выкарыстоўваць менавіта гэты сродак для барацьбы з сексуальнымі вычварэнцамі. Думаецца, што ўсе рэкорды тут пабіла здавалася б ціхая Чэхія.

Адпаведны закон дзейнічае тут з 1978 года. Пры гэтым нават пасля падзення камунізму Прага не пажадала яго адмены. Закон пра хімічную кастрацыю даўно стаў прадметам спрэчак паміж Прагай і еўрапейскімі структурамі. Савет Еўропы неаднаразова патрабаваў ад чэшскіх уладаў прыпыніць практыку кастрацыі. Аднак чэхі пакуль што не здаюцца. Па-першае, статыстыка паказвае, што ніводны з «кастратаў» больш не здзейсніў злачынства на сексуальнай глебе. Па-другое, самі злачынцы, якія асуджаныя на кастрацыю, не супраць яе. У іншым выпадку ім пагражае пажыццёвае зняволенне. Па афіцыйных дадзеных, ужо ў гэтым стагоддзі чэхі паспелі прапісаць гэту працэдуру 98 пацыентам.

Якія аргументы прыводзяць праціўнікі кастрацыі? На іх думку, працэдура хімічнай кастрацыі зневажае гонар асобы, мае сур'ёзныя псіхічныя наступствы.

У якасці прыкладу яны прыводзяць вядомага брытанскага вучонага матэматыка Алана Цьюрынга. Апошні зрабіў каласальны ўнёсак у перамогу над нацыстамі. Падчас вайны раскрыў сакрэтны код нямецкіх вайсковых шыфравальшчыкаў, што дазволіла брытанцам загадзя ведаць пра час і цэлі налётаў Люфтвафэ. Аднак пры гэтым ён аказаўся гомасексуалістам. У 1952 годзе яго інтымнае жыццё стала прадметам галоснасці. Следам рушылі пазбаўленне месца працы, судовы працэс (на той час гомасексуалізм быў пад забаронай) і як вынік — хімічная кастрацыя. Прыблізна праз год, не вытрымаўшы дэпрэсіі, вучоны пакончыў з жыццём.

Акрамя псіхічных праблем, на думку праціўнікаў хімічнай кастрацыі, у пацыентаў могуць быць праблемы са здароўем. Сапраўды, на гэты час медыкі яшчэ не маюць поўнага адказу, як прэпараты, якія ўжываюцца падчас хімічнай кастрацыі, у доўгатэрміновай перспектыве ўплываюць на арганізм.

Што да нашага рэгіёну, то ідэя хімічнай кастрацыі, думаецца, папросту асуджана на поспех. Пра гэта сведчыць прыклад Польшчы. Увогуле, ідэю хімічнай кастрацыі прапанавалі лібералы з партыі «Грамадзянская платформа». Іх канкурэнты з партыі «Права і Справядлівасць» спачатку абвінавацілі тых у жаданні выкарыстаць тэму ў мэтах палітычнай рэкламы, аднак урэшце падтрымалі «кан'юнктурны» праект. Які нармальны палітык будзе галасаваць у абарону вычварэнцаў?

Галоўнае пытанне, ці дапаможа гэта? Вось думка спецыяліста, намесніка старшыні Камітэта Дзярждумы па ахове здароўя акадэміка РАН Сяргея Стальмахава, які пракаментаваў законапраект для ІТАР-ТАСС:

— У адносінах да гвалтаўнікоў гэта правільна... Але бяда ў тым, што пры гэтым у педафілаў узнікае своеасаблівая агрэсія ў адносінах да дзяцей: хімічнай кастрацыяй палавую актыўнасць можна прыбраць, але агрэсіўнасць застаецца. Акрамя палавых органаў, тэстастэрон выпрацоўваецца яшчэ наднырачнікамі, што хімічнымі рэчывамі немагчыма прыбраць, і таму дзеці могуць падвяргацца з боку педафілаў фізічнаму гвалту. Я не ведаю, якое рашэнне прыме парламенцкая большасць пры абмеркаванні гэтага законапраекта, але, думаецца, дэпутаты падыдуць да гэтага пытання асцярожна і разумна».

КАНФЛІКТ

# ВЫРАТАВАЦЬ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЮ

Алег НОВІКАЎ

**Беспрэцэдэнтная параза нямецкіх сацыял-дэмакратаў на выбарах 28 верасня справакавала ўнутраны партыйны канфлікт.**



Франк Вальтэр Штайнмаер

У параўнанні з вынікамі выбараў пяцігадовай даўніны, Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (SPD) згубіла трэцюю частку свайго электарату, або каля двух мільёнаў прыхільнікаў. Прыкладна 700 тысяч экс-выбарцаў SPD прагаласавалі за Партыю левых. Адзін мільён перабег у лагер лібералаў і хрысціянскіх дэмакратаў. Астатнія ўвогуле перасталі цікавіцца палітыкай. Яшчэ ніколі ў гісторыі ФРГ планка папулярнасці эсдэкаў у грамадстве не была такой нізкай.

Старшыня партыі Франк Вальтэр Штайнмаер, аднак, не згубіў твар. Ён рашуча абвясціў, што SPD пасля 11 гадоў знаходжання ва ўрадзе сыходзіць у апазіцыю. Ён асабіста ўзначаліць фракцыю. Старшынёй павінен стаць Франц Мюнтэферынг, якога называюць «лейтэнантам Шродэрам» за блізкасць да былога канцлера.

І раптам замест таго, каб аб'яднацца вакол кіраўніцтва ў такія цяжкія часы, партыйны базіс паўстаў. Спантанна ўзнікла аб'яднаная апазіцыя, якая прапанавала свой пакет кандыдатур на галоўныя партыйныя пасады. Адным словам, путч.

Канфігурацыя кіраўніцтва партыі, на думку путчыстаў, павінна выглядаць наступным чынам: Андрэа Налес — генеральны сакратар. Мэр Берліна Клаус Воверайт (аўтар славутай фразы: «Я гей, і гэта добра») і Олаф Шольц — віцэ-старшыня. Нарэшце, лямку старшыні збіраецца цягнуць Зігмар Габрыэль. Ён — душа змовы супраць шродэраўскай гвардыі, адзіная надзея фанатаў сацыял-дэмакратыі на аднаўленне SPD.

Зігмар Габрыэль, былы міністр прыроды ў «вялікай кааліцыі», нарадзіўся ў 1959 годзе ў Ніжняй Саксоніі, пасля вайсковай службы вывучаў палітыку і сацыялогію ва універсітэце Гётынгена. Перад тым, як пачаць палітычную кар'еру, працаваў настаўнікам на радзіме. На гэты час ён быў адным з лідэраў моладзевай секцыі SPD «Сацыялістычная моладзь Германіі — Сокалы», дзе належаў да марксісцкага крыла.

Пасля Зігмар працаваў у зямельным парламенце, і нават нейкі час кіраваў зямельным урадам. На выбарах 2003 года як кандыдат SPD на пасаду старшыні ўраду зямлі Ніжняя Саксонія праваліўся. Аднак у 2005 годзе перабраўся ў Бундэстаг і адразу стаў мега-зоркай нацыянальнага маштабу. У «вялікай кааліцыі» яму даручылі пасаду міністра прыроды.

На фоне іншых міністраў-сацыялістаў, якія яўна тушаваліся на фоне асобы Меркель, малады міністр выглядаў вельмі не стандартна. Ён хутка перасварыўся з канцлерам з-за яе намераў перагледзець праграму закрыцця атамных станцый (адно з галоўных дасягненняў з былога кабінета эсдэкаў і Зялёных).

Пры ім Германія стала адным з лідэраў так званага Кіёцкага працэсу. Тэма змены клімату стала часткай унутранай палітычнай палемікі. Падчас выбарчай кампаніі ў Бундэстаг Габрыэль запомніўся публіцы эмацыйнымі атакамі на Меркель, што прынесла яму славу асабістага ворага канцлера.

Цяперашняя вайна групоўкі Мюнтэферынга і фракцыі Габрыэля — больш чым вайна за пасады. Гэта канфлікт ідэй. Атачэнне Габрыэля выступае за левы паварот SPD, першым знакам якога павінен стаць тактычны саюз з Партыяй Левых (нашчадкі ўсходненямецкіх камуністаў плюс левая фракцыя прафсаюзаў). У перспектыве партыі плануюць разглядаць сябе як патэнцыйных партнёраў у федэральным урадзе.

Тактыку «лева руля!» рашуча адмятае Штайнмаер і кампанія. Ён выключае магчымасць кааліцыі з левымі на ўзроўні ўраду. Штайнмаер кажа, што левы паварот будзе значыць канец мадэлі «Народнай партыі», якая арыентуецца не толькі на працоўны клас, а на больш шырокія колы грамадства. На ягоную думку, лагічным наступствам сыходу налева стане ператварэнне ў клієнцкую партыю невялікай групы соцыуму, напрыклад прафсаюзаў. Радыкальная левая рыторыка ў цяперашніх умовах глабалізацыі — банальны папулізм. І правал на выбарах звязаны з тым, што сацыял-дэмакраты не стварылі сабе рэнаме партыі прагрэсу.

Вырашальная бойка паміж групоўкамі адбудзецца 11–13 лістапада ў Дрэздэне падчас федэральных збораў. Яе вынікі могуць стаць пачатак новага этапу ў гісторыі самай старой партыі Германіі.

З іншага боку, Зігмара цяжка назваць радыкалам. Ён належыць да унутрыпартыйнай групы «Seeheimer», якая ўзнікла ў сярэдзіне 1970-х як рэакцыя правых сацыял-дэмакратаў на спробы моладзі зрабіць з SPD партыю паслядоўных марксістаў. У пачатку 1980-х менавіта людзі з «Seeheimer» падтрымалі ідэю размясціць у ФРГ амерыканскія крылатыя ракеты.

Акрамя таго, як адзначаюць палітолагі, Ніжняя Саксонія, адкуль паходзіць Зігмар, — гэта радзіма і кавальня партыйных кадраў блізкіх асабіста да Герхарда Шродэра. Апошні доўгі час кіраваў мясцовай секцыяй SPD.

Цалкам магчыма, што ніякага «левага павароту» і «радыкальнага разрыву са спадчынай Шродэра» не будзе. Тым больш, што глабальных адказаў на выклікі рэчаіснасці ў левацэнтрыстаў няма. Сярэдняму класу, да якога адносіць сябе большасць насельніцтва ФРГ і які, як ні парадаксальна, па-сутнасці ёсць прадуктам эсдэкаўскай мадэлі Sozialstaat (сацыяльная дзяржава) 1970–1980-х гадоў, ментальна, па жыццёвых каштоўнасцях, бліжэй Ангела Меркель.

Між тым, 5 кастрычніка кіраўніцтва SPD дазволіла Зігмару Габрыэлю балатавацца на пасаду старшыні партыі ў Дрэздэне. Першы крок зроблены.




Рэкламны білборд партыі: «Фінансавыя акулы абралі б СвДП»

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### УМБЕРТА БОССІ

Лідэр італьянскай правай партыі «Ліга Поўначы», якая выступае за стварэнне федэратыўнай дзяржавы, дзе больш эканамічна развітая Поўнач будзе мець значную аўтаномію, нечакана заявіў, што ён — рэінкарнацыя рыцара. Прызнанне адбылося падчас прэм'еры ў Мілане фільма «Барбароса». Фільм сярод іншага распавядае пра барацьбу сярэднявечнага германскага імператара Фрыдрыха Барбароса з гарадамі Паўночнай Італіі. Сэрцам таго супраціву была Ламбардыя, а галоўным героем — рыцар Альберта дзі Джусана. Яго імя з тых часоў стала легендарным. Шмат хто з палітыкаў (напрыклад Мусаліні) выкарыстоўвалі яго для прапаганды. Аднак так далёка, як Боссі, ніхто не заходзіў. «Альберта дзі Джусана — гэта я», — сціпла заявіў Умберта падчас прэзентацыі карціны. А вось імператар Барбароса нагадаў яму цяперашніх італьянскіх левых, якія выступаюць супраць федэралізацыі, за дзяржаўны цэнтралізм.

### МІКОЛА СЕРДЗЮК



Губернатар Адэскай вобласці нечакана ўмяшаўся ў вялікую дыпламатыю і ў ход выбарчай кампаніі ў Румыніі (там 22 лістапада пройдуць прэзідэнцкія выбары). Ён заявіў, што не дапусціць устанаўлення ў вёсцы Азёрнае пад Ізмаілам помніка маршалу Аляксандру Аверэску. Аверэску быў кіраўніком румынскага генштабу, камандуючым фронтам падчас першай сусветнай вайны, прэм'ер-міністрам. Аднак больш за ўсё ён праславіўся тым, што ў 1917 годзе захапіў Бесарабію, якая да 1940 года заставалася часткай Румыніі. Хаця Аверэску памер у 1938 годзе, Адэскі аблвыканкам лічыць, што помнік яму будзе сімвалам румынскай акупацыі і актам палітыкі румынізацыі Паўднёвай Бесарабіі і Букавіны, якую зараз праводзіць Бухарэст. Аднак стала вядома, што за ідэяй з помнікам стаяць вельмі ўплывовыя сілы. У прыватнасці, Крысціян Дзяканэску, цяперашні дырэктар румынскага МЗС, кандыдат у прэзідэнты. Гэта ён прапанаваў ідэю помніка, каб прыцягнуць галасы электарату. І самае цікавае, што згоду даў украінскі міністр замежных спраў. За помнік Аверэску ва Украіне румыны пагадзіліся адкрыць у сябе помнікі Тарасу Шаўчэнку і Багдану Хмельніцкаму. Цалкам верагодна, што Кіеў увогуле робіць стаўку на Дзяканэску. У гэтым кантэксце шансы Сердзюка заблакаваць ушанаванне румынскага вайскоўца шмат хто лічыць амаль не рэальнымі.

### ЦІЛА САРРАЦЫН

64-гадовы былы фінансіст і дэпутат ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі даў скандальнае інтэрв'ю выданню «Lettre International», у якім рэзка прайшоўся па эміграцыйнай палітыцы берлінскіх уладаў, якія, на яго думку, да гэтага часу жывуць міфамі студэнцкай рэвалюцыі 1968 года. У прыватнасці, ён заявіў, што арабскія і турэцкія эмігранты не выконваюць ніякай прадуктыўнай функцыі, акрамя гандлю садавінай. У выніку большасць гэтай часткі насельніцтва не здольная да інтэграцыі. «Тыя, хто жывуць за кошт дзяржавы, павінны займацца адукацыяй сваіх дзяцей, а не выраблениям дзяўчынак у хустках», — заявіў Саррацын. Тут і пачалося: лідэры прафсаюзаў, сярод сяброў якіх шмат турэцкіх працоўных, рэзка асудзілі выказванні дэпутата. Частка эсдэкаў запатрабавала выключэння яго з партыі. «Bundesbank», дзе Саррацын быў назіральнікам, папрасіў экс-палітыка пакінуць кіраўніцтва банку, каб не ствараць яму дрэнны імідж. Пракуратура ўжо пачала разгляд іску за распальванне міжнацыянальнай варожасці. Сам дэпутат хуценька папрасіў прабачэнне. Але ў гэты самы момант Томас Шмідт, рэдактар уплывовай газеты «Der Welt», публічна падтрымаў Саррацына, напісаўшы на сваім блогу, што высновы палітыка «адпавядаюць рэчаіснасці». У выніку скандал яшчэ толькі разгараецца.



ВІЛЕНСКАЯ ШКОЛА

# СЫН ЗА БАЦЬКУ…

## МАСТАК СЯРГЕЙ ВІШНЕЎСКІ






Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Шаўляй—Вільня—Докшыцы — назвы, якія акрэсліваюць жыццёвы і творчы шлях заходнебеларускага жывапісца і фотамастака Сяргея Антонавіча Вішнеўскага. Паміж дзвюма датамі: 1909–1992.**



Прашнураваўшы млявымі, не надта людnымі восеньскімі вулачкамі Докшыц скрозь былую Барысаўскую, я збочыў на былую Полацкую і неўзабаве апынуўся ля непрэзентабельнага будыначка з шыльдай «Дом Рамёстваў». Сын Сяргея Вішнеўскага, да якога я ехаў, мастак-педагог гэтага «Дома», быў на рабочым месцы. Прадставіўся: «Алесь Вішнеўскі».

Алесь Вішнеўскі — ураўнаважаны, думны, далікатны, упарты і крыху сарамлівы мужчына, трохі вышэй сярэдняга росту, з чыстымі і тонкімі рысамі твару, у свае шэсцьдзесят выглядаў маладзей. Закончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута ў 1970 годзе. Папрацаваў у Віцебску, але пакінулі бацькоўскія мясціны. «Хацеў мець вялікую майстэрню, працаваць творча. Жыццё ж унесла свае карэктывы», — тлумачыць Алесь Сяргеевіч. Зараз ён займаецца керамікай. Лаўрэат абласной выставы народнага мастацтва «Кругазварот–1998», удзельнік і дыпламант рэспубліканскага свята «Ганчарны круг» цягам некалькіх гадоў.

«Дарэчы, — усміхаецца Алесь, — памяшканне студыі — гэта колішняя царква Св. Яна Багаслова. Была яна перанесена са старых, агульных праваслаўна-каталіцкіх могілкаў (з Даўгінаўскай). Царкву Покрыва св. Багародзіцы будавалі, а ў Св. Евангеліста і Апостала Яна Багаслова службу правілі. Памятую, як мяне малога вадзілі сюды на прычасце».

Ён паказвае фрагменты фрэсак, што захаваліся. Распавядае пра знаходку роспісаў, як ён вызваліў некалькі лікаў ад слою тынкоўкі, кажа, што роспісы ёсць і наверсе, але з-за аварыйнага стану будынка патрапіць туды немажліва, паказвае, дзе іконы віселі, дзе падсвечнікі стаялі, адкуль святар выходзіў. «Потым тут была бібліятэка, а як кабетам-супрацоўніцам на галаву пасыпалася тынкоўка, памяшканне аддалі пад мастацкую майстэрню. Праводзім тут заняткі па разьбе і кераміцы, на якія ходзяць дзятва і з Докшыцаў, і недалёкіх Барсукоў, Параф'янава, Таргуноў», — заканчвае ён караценькі экскурс.

### Вільня

Адчуванне і бачанне навакolля і шырэйшага свету перадаваць фарбамі Сяргей Вішнеўскі намагаўся з маленства. Але невядома, што сталася б з гэтага, калі б работы юнака, якія ўпрыгожвалі ў 1930-я гады інтэр'ер адной з докшыцкіх гасцініц, не запрыкмецілі браты Слатвінскія, Людамір і Мірaслаў. Яны і намовілі старэйшага Вішнеўскага адпусціць сына ў вялікі горад, далі юнаку пакойчык у сваім віленскім доме, фундавалі яго навучанне.

Такім чынам, у 1934 годзе, вытрымаўшы ўступныя іспыты, Сяргей стаў студэнтам мастацкай школы імя Адама Міцкевіча.

Трапіўшы ў Вільню, мястэчковы маладзён Сяргей Вішнеўскі быў агаломшаны горадам-казкай. Бажніцы ўсіх канфесій, чароўная музыка шматмоўнай гаманы вялікага места, святло газавых ліхтароў, бібліятэкі, кавярні і вітрыны разнастайных крамаў, будынкі-помнікі, выставы сапраўдных твораў сапраўднага мастацтва, а галоўнае, новае кола людзей творчых і прагных на веды — усё гэта спрыяла развіццю разумовых здольнасцяў, сталенню душы і сэрца.

Ужо ў 1960-я, вандруючы разам з сынам, Сяргей Антонавіч паказваў нашчадку той двухпавярховы дамок на рагу былых вуліц Цвяточнай і А. Міцкевіча, у якім жыў і працаваў, паказваў, дзе месцілася мастацкая школа, тую крамку, у вітрыне якой, па дамоўленасці з гаспадаром, выстаўляў творы на продаж. І распавядаў, як, не ўбачыўшы работу за шклом, здагадваўся: прададзена! Атрымоўваў ганарар і адразу ж ладзіў сабе свята: купляў процьму фарбаў, грунтовак, пэндзляў і іншага мастацкага рыштунку. На сконе жыцця ён усё шкадаваў: «Як жа ж тады фарбаў не накупіўся!»

### Творы

Творчы даробак мастака таго часу — 19 партрэтаў, напісаных алеем у 1934–1939 гадах, мы мелі магчымасць упершыню пабачыць на персанальнай выставе, зладжанай у галерэі фальварка «Добрыя мыслі» ў 2005 годзе.

Работы, пісаныя мяккім, слухмяным пэндзлем, выразныя і запамінальныя. Перавага, аддадзеная партрэту, лучыць іх з гуманістычнымі традыцыямі Віленскай школы. Разнастайнасць тыпажоў: падлеткі, людзі сталага веку і старыя, жанчыны і мужчыны розных слаёў грамадства, за выключэннем хіба элітаў і ўяўных маргіналаў, відавочна сведчыць пра жыццёвую скіраванасць яго творчасці.

Пры відавочных здольнасцях і ўмельстве маладога мастака: плотнай і ўстойлівай кампазіцыі, не спрошчанай, а дарэчна абмежаванай каляровай палітры, пры ўсім вельмі своеасаблівым рэалізме, які хіба што вельмі фармальна і з вялікім дапушчэннем можна вызначыць як «тыпалагічна блізкі да твораў Сергіевіча і Сеўрука». Пры сканцэнтраванасці вобразаў і большай псіхалагічнай глыбінёй, чымсьці ў многіх, зараз вядомых нам заходнебеларускіх творцаў, ёсць у ягоных палотнах нешта такое, што калі не бянтэжыць, то насцярожвае. Пэўная адчужанасць героеў партрэтаў Вішнеўскага, замкнёных у сабе — позірк іх скіраваны скрозь гледача або ўнутр сябе.

### Докшыцы

Абараніўшы дыпломную працу (карціна «Чалавек на фоне гарадскога краявіду»), Сяргей Вішнеўскі пабраўся шчаслівым шлюбам з докшыцкай дзяўчынай Антанінай, што працавала ў Вільні пакаёўкай. Яшчэ на нейкі час затрымаўся ў горадзе, які паспеў палюбіць. Але бацька Антон, які нацешыўся грамадскім варушэннем, прыдбаў шнурок зямлі (ад Параф'янаўскай дарогі да Беразіны) і паклікаў на гаспадарку.

Дух правінцыйных Докшыцаў, дзе людзі, абцяжараныя змаганнем за выжыванне, жылі бягучымі клопатамі мінаючага дня, быў далёкім ад творчасці і мастацтва. Як кажа Алесь Сяргеевіч, жыццё падпарадкоўвала, падмінала. Вадаспадам абрынуліся «навіны» на галаву жыццёва не надта спрактыкаванага мастака Сяргея Вішнеўскага.

Напрыканцы 1930-х гадоў пажар перакінуўся ад суседзяў і знішчыў іх хату. Вялікая сям'я (усе, ад дзядоў да ўнукаў, жылі пад адным дахам) мусіла адбудоўвацца наноў. Паспрабаваў сябе мастак і ў іканапісу, каб утрымліваць жонку, мець гарантаванае «заўтра», пайшоў выкладаць малюнак у школу.

Пачалася другая сусветная вайна. У мястэчку з'явіліся савецкія вызваліцелі. Разрабавалі сядзібу Слатвінскіх у Гняздзілаве. Непатрэбшчыну — маёнтак, творы мастацтва, вялізную бібліятэку — пусцілі дымам. Наіўнага пана Людаміра пад канвоем адправілі на Усход. Мірaслаў, які жыў у добрай згодзе са сваімі сялянамі, мусіў ратавацца ўцёкамі. Аб'явіўся ўжо пад немцамі, але ўзімку 1943 года яго напаткала рука народных мсціўцаў — «жалезнякоўцаў». «Не любіў, а мо і пабойваўся згадваць пра тыя часіны бацька, — кажа Алесь Сяргеевіч. — Але распавядаў, як яны разам з конюхам пахавалі свайго пана Мірaслава».

Мінула вайна. У Докшыцах з чатырох тысяч будынкаў ацалела трохі болей за дзве сотні, і туліліся яны, па большасці, на ўскрайках. За гады навалы тры тысячы чалавек было расстраляна ці закатавана. Наракаць у такіх варунках на адсутнасць творчай атмасферы, «адсутнасць арт-рынку», на незапатрабаванасці мастацтва не выпадала. Але разуменне гэтага не цешыла душу школьнага настаўніка малявання, пабуджанага да творчасці яшчэ ў часы міжмір'я. Душа прагна шукала выйсця.

### Фотамастак

Такая навамодная прылада, як фотаапарат, была вядома і ў паваенных, і ў даваенных Докшыцах. Фотакамера была не цудам, але дзівам дзіўным. Хто-ніхто ведаў здымкі майстра з «мясцовых» Пётра Юзэфовіча, «за польскім часам» працавала тут некалькі прадпрымальнікаў з ліку местачковых. У 1950-я гады ў гарадку з'явіліся дэмабілізаваныя пераможцы. Асобныя з іх, апрача наручных гадзіннікаў ды «тэтэшнікаў», мелі ўласныя трафейныя фотаапараты.

Яшчэ падчас навучэння ў Вільні Вішнеўскі зацікавіўся і захапіўся «магічнай справай» фатаграфавання. Займаўся ў гуртку славутага майстра — Я. Булгака з Наваградчыны. Можна сцвярджаць, што першыя фотаздымкі Вішнеўскага — рэха даваеннага жыцця.

Выспу цудаў — прафесійную фотастудыю ў Докшыцах, са шкляным дахам для натуральнага асвятлення, сафітамі, разнастайнымі бутафорскімі рэчамі і антуражнымі дэталямі і інсталяцыямі, жывапіснымі заднікамі, іншым адмысловым рэквізітам, ён зрабіў напрыканцы 1940-х гадоў. Праіснавала яна да таго часу, як у гарадку распачалося энергічнае будаўніцтва. Было гэта ў другой палове 1960-х. На месцы фотамайстэрні зараз стаіць будынак райвыканкаму. Майстар жа мусіў прыстасаваць пад майстэрню ўласную хату.

Сумленна-пільнае стаўленне да працы, памножанае на патэнцыял мастака-партрэціста спрыялі нараджэнню фоташэдэўраў. Самыя значныя імгненні чалавечага быцця, ад нараджэння да кладаў, увекапомненыя выразна і кампазіцыйна нязмушана.

### Партрэт невядомага

У пакойчыку, дзе фактычна месціцца галерэя твораў Сяргея Вішнеўскага, з агульнага шматгалосся вобразаў і чалавечых лёсаў вылучаецца пагрудны франтальны партрэт згрaбнага, досыць валявога юнака з дапытлівым позіркам (не толькі рукі, але і вочы мог мастак пісаць!) блакітна-шараватай сарочцы паўспартовага крою з уладарна скрыжаванымі рукамі на нейтральным, каларыстычна складаным фоне. Адзін з нешматлікіх партрэтаў майстра, з якіх мадэль жорстка і бескампрамісна літаральна ўпіваецца сваім позіркам у гледача.

«Далёкая суродзічка з Польшчы, — распавядае Алесь Сяргеевіч, — пані Раіса (прафесар беларусістыкі Кракаўскага універсітэта), пазнала яго. Юнак гэты — сын памешчыка з-пад Дзісны (маёнтак Дарожкавічы) Капылова. Таго, што пасля канфіскацыяў 1863–1864 гадоў уладарыў у маёнтку братоў Каstравіцкіх: Караля — бацькі Каруся Каганца, Адама і Апалінара — бацькі паэта Гіёма Апалінэра».

Жывапісныя творы Сяргея Антонавіча зберагае сын Алесь. Партрэты 1930-х гадоў вярэдзілі мастацкасць яго душы і вызначылі яго асабісты выбар. Сын Алеся Сяргеевіча таксама мае мастацкую адукацыю, але свой уласны выбар зрабіў на карысць больш прагматычнага часу.

ЮБІЛЕЙ

# «БУДЗЬМЕ» — ГОД!

Ева ВАЙТОЎСКАЯ



**Старажытны шляхецкі тост — дзеяслоў загаднага ладу «Будзьма!» цягам апошняга года ператварыўся ў беларускім слэнгу ў назоўнік. «Будзьма, будзьмы, будзьме, пра будзьму, з будзьмай», — скланяюць беларусы. 1 кастрычніка 2009 года унікальнай грамадскай ініцыятыве «Будзьма беларусамі!» споўніўся год.**

Год таму кампанію ініцыявалі дзесяць грамадскіх арганізацый, сёння іх ужо 31. Акрамя гэтага, да арганізацыі і правядзення імпрэзаў кампаніі цягам года далучыліся яшчэ 92 «культурныя адзінкі» — арганізацыі і ўстановы, рэдакцыі СМІ і інтэрнэт-рэсурсы, творчыя асобы і калектывы. За год па ўсёй Беларусі прайшло больш за 900 імпрэзаў: выставы, канцэрты, экскурсіі, літаратурныя сустрэчы, гістарычныя лекцыі, шоу беларушчыны, курсы беларускай мовы, прэзентацыі кніг і часопісаў ды інш. Гледачамі і ўдзельнікамі нашых мерапрыемстваў сталі каля 75 000 чалавек у амаль 150 населеных пунктах Беларусі. Былі рэалізаваныя праекты: «Як я стаў беларусам», «Тузін. Перазагрузка», «Паганства», фотаконкурсы «Будзьма беларусамі!» і «Турыстычная Беларусь». Выдадзена цэлая серыя бясплатных дызайнерскіх паштовак «Будзьма!», музычны дыск «The best Folk-modern». Скончана праца над дыскам-двайнікам «Budzma the best rock».

«Першы год правядзення кампаніі прадэманстраваў: попыт на сучасны беларускі культурны прадукт значна перавышае прапанову. І вырашыць гэту праблему можна толькі супольнымі намаганнямі ўсіх зацікаўленых бакоў. Паасобку ні грамадскія арганізацыі, ні дзяржаўныя структуры такі попыт задаволіць не ў стане. І толькі аб'яднаўшы намаганні, можна данесці да людзей усё багацце сучаснай беларускай культуры, якая з'яўляецца падмуркам для фармавання мадэрнай беларускай нацыі, — канстатуе прэс-служба грамадскай кампаніі. — Інфармацыйнай пляцоўка кампаніі «Будзьма беларусамі!» — сайт budzma.org — ператвараецца ва ўнікальны культурніцкі інтэрнэт-рэсурс. На ім месяцца не толькі навіны кампаніі, але і дайджэст навінаў, якія датычаць сучасных культурна-грамадскіх актуалій Беларусі, а таксама ўласная інфармацыйна-інтэлектуальная прадукцыя: рэпартажы з культурніцкіх імпрэзаў, кніжныя рэцэнзіі, аўтарскія праекты. Наведвальнасць сайта расце з кожным днём».

Ад сябе дадам, што, магчыма, упершыню ў гісторыі незалежнай беларускай мас-культуры ў жыццёвую прастору трапіла столькі прывабных і густоўных «фенечак». Фірмовая торбачка budzma.org — жаданы сувенір для асобаў нефармальнага мыслення любога веку, а ярка-чырвоныя футболкі з лагатыпам кампаніі выпускаюцца і дзіцячыя, і дарослыя, і мужчынскія, і жаночыя — да твару любому беларусу, беларусцы, беларусіку. Прыемна насіць і рэкламаваць добрую справу. Будзьма!

### «Будзьмаўцы» пра «Будзьма!»

**Ніна Шыдлоўская:**

— Не сакрэт, што цэнтрам культурнага жыцця краіны з'яўляецца сталіца. Дзякуючы імпрэзам кампаніі «Будзьма беларусамі!» шмат людзей у рэгіёнах упершыню дазналіся пра розных творцаў і творчых праектаў сучаснай беларускай культуры.

**Ігар Лялькоў:**

— За год культурніцкія акцыі нашай кампаніі наведалі дзесяткі тысяч людзей. Самае прыемнае, што сярод гледачоў і слухачоў не было выразнага падзелу на беларускамоўных і рускамоўных, юных і сталых, бяднейшых і заможнейшых. Імпрэзы «Будзьма беларусамі!» выявіліся аднолькава цікавымі для ўсіх. Мы з радасцю пераканаліся, што сапраўды якасная культура спрыяе паўстанню агульнанацыянальнай культурнай прасторы. Людзі жадаюць усведамляць сваю прыналежнасць да адзінага народа, і культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!» дапамагае ім у гэтым.

**Алена Макоўская:**

— Радуе, наколькі спрыяльна да імпрэзаў «Будзьма беларусамі!» ставіліся ў бібліятэках, дамах культуры, музеях, галерэях, навучальных установах. Вельмі прыемна, што многія звярталіся паўторна. Нам адмаўлялі ў правядзенні імпрэзаў у межах кампаніі вельмі рэдка.

**Севярын Квяткоўскі:**

— Быць беларусам — гэта клёва! Гэта сучасна, гэта модна, гэта перспектыўна. Ведаць гісторыю і культуру і бачыць перспектыву — вось што значыць быць беларусам. Такое ўражанне складаюць наведнікі сайту budzma.org. За год склалася кола сталых наведнікаў, якое ўвесь час павялічваецца. Пераважна гэта моладзь да 24-х гадоў.

ГАЛЕРЭЯ

# ЯК ПРАЙСЦІ Ў «Ў»

Алесь ГІНЗБУРГ

**Напрыканцы вясны «НЧ» спяшаўся развеяць чуткі пра раптоўнае высяленне з крамы «Падземка» арт-хаўз галерэі, праінфармаваўшы чытача, што адно з галоўных месцаў прапіскі нефармальнага мастацтва «паляцела, але абяцала вярнуцца». Творчы калектыў галерэі абяцанне выканаў. 7 кастрычніка ў Мінску адбылося адкрыццё галерэі сучаснага мастацтва «Ў». Пад адным дахам цяпер суседзяць выставачная частка былой «Падземкі» і кнігарня выдавецтва «Логвінаў».**

Праспект Незалежнасці 37 А — нават калі вы ўжо стаіце на галоўнай вуліцы сталіцы, гэты адрас вас нікуды не прывядзе, калі не праявіць кемлівасць. Як і ўсё нестандартнае ў цэнтры Мінска, дамок галерэі схаваўся ў двары — проста за будынкам «Подвиг народа». Тое, што вы пабачыце, падышоўшы, і сапраўды подзвіг. Усяго за лета тры субтыльныя спадарыні — Валянціна Кісялёва, Ганна Чыстасердава (мастацкая секцыя) і Аляксандра Дынько (літаратурная секцыя) пры падтрымцы таварышаў арандавалі, пачысцілі, адрамантавалі былы... пункт прыёму шклатары. Што ж, цяпер звычка моладзі хавацца ад гарадскога шуму ў цёмных дварах атрымае пэўнае культурнае напаўненне...

«Ў» — унікальная літара беларускага алфавіта. Так ці іначай, у «Ў» ствараюць прастору найперш для сучаснага беларускага мастацтва і найшоўшай беларускай літаратуры. Што і пацвердзіла імпрэза адкрыцця, дзе гучалі тэксты сучасных беларускіх аўтараў у выкананні як гэтых самых аўтараў, так і акцёраў. Графік выставаў у галерэі распісаны на паўгода наперад, у кнігарні расклад вальнейшы, але і тут будуць рэгулярна ладзіцца літаратурныя вечары, прэзентацыі новых выданняў. А неўзабаве дзяўчаты плануюць адчыніць у будынку кавярню і прапанаваць яе як месца сустрэч творчай інтэлігенцыі.

### Бліжэйшыя імпрэзы галерэі «Ў»:

Выстава мастака Сяргея Кірушчанкі «Earth Art» («Надышоў час шчыльна заняцца прыземленым самацтвам»). Доўжыцца да 26 кастрычніка.

12 кастрычніка прэзентацыя кнігі Аляксандра Сапегі «Сто чашек яблочного чая». У кнізе бубнача джаз-бэнду «Apple tea», сабраныя літаратурна апрацаваныя анекдоты — непрыдуманыя гісторыі з жыцця музыкаў і не толькі.




Фота Юрыя Дзядзінкіна

РЭЦЭНЗІЯ

# КНІГА З ГАРОДНІ

Алесь ГІНЗБУРГ

**У сярэднія вякі ў знак атрымання еўрапейскім горадам Магдэбургскага права на яго цэнтральнай плошчы будавалі ратушу. Але для людзей адукаваных важным знакам самадастатковасці горада была яшчэ адна рэч — ці мае горад уласную друкарню.**

Калі ў 2006 годзе ў Гродна Рухам «За свабоду» была заснаваная выдавецкая серыя «Гарадзенская бібліятэка», гэта стала добрай навіной для ўсіх, хто сочыць за развіццём незалежнага, самастойнага беларускага кнігадруку. Нядаўна пабачыла свет 8-я кніга серыі — «Рыцары і дойліды Гародні», аўтар якой — доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч.

Зрэшты, мы паспяшаліся назваць серыю цалкам самастойнай. Гэта не бізнес-праект, выданні ажыццяўляюцца пры шчыльным супрацоўніцтве з польскімі інстытуцыямі, сама ж кніга была надрукавана ў Кракаве. Але факт ёсць фактам: у Беларусі рашуча заявіла пра сябе гроднацэнтрычная літаратура.

Хоць у кнізе нідзе не напісаны ўзрост яе асноўных адрасатаў — мы прызвычаіліся, што такія выданні прызначаны для школьнікаў. У гэтай сувязі хочацца адзначыць густоўную працу ілюстратара Паўла Татарнікава — мастака-графіка, сябра Беларускага саюза мастакоў, дацэнта кафедры графікі БДАМ. Зрэшты, калі кіравацца вядомым тэзісам, любы, хто ў Беларусі спасцігае Беларусь, — дзіця, вялікае ці малое. Таму пачытаць кнігу будзе цікава ўсім, хто неабыякавы да гісторыі гарадзенскага краю.

Кніга мае выдатна прадуманую кампазіцыю. З аднаго боку, у ёй тры раздзелы, што звужаюць аповед пісьменніка-гісторыка тэматычна: «Гарадзенскі замак», «Вялікі князь Вітаўт», «Майстар — наш продак». З іншага — праз гісторыю гарадзенскага замка, жыццяпіс Вітаўта ці апісанне археалагічных знаходак праступае гісторыя гарадзенскага краю і шырэй — старажытнага Вялікага княства Літоўскага.

Пра раздзел «Майстар — наш продак» хочацца сказаць асобна. Заснаваны на аднайменнай кніжцы А. Краўцэвіча 1990 года, ён карэктуе адну важную рэч у масавай свядомасці, якая пануе там яшчэ з савецкіх часоў. Нашы продкі не толькі зямлю аралі! Праз энцыклапедычныя выкладкі пра старажытныя вырабы са шкла, каменя, косці, жалеза, гліны вымалёўваецца побыт беларускіх гарадоў і мястэчак — Міра, Любчы, Ашмянаў, Наваградка і іншых слаўтых паселішчаў Гарадзеншчыны.

Асабліва мяне ўразіла апісанне такога віду народнага посуду, як рынка. Рынкі — гліняныя патэльні на трох ножках і з ручкай у выглядзе ўтулкі. Месяц таму маці купіла такую ў ГУМе. На цэтліку было напісана: «Выдатна падыходзіць для разагравання ежы ў мікрахвалёўцы». Вось вам і повязь часоў!

Кнігу «Рыцары і дойліды Гародні» можна набыць у гродзенскай кнігарні «Кнігі» (Гарнавых, 7), а таксама ў Цэнтры беларускай кнігі (Будзёнага 48а–44, памяшканне ТБШ), а таксама ў кнігарнях Мінска.

### Іншыя выданні «Гарадзенскай бібліятэкі»:

Ю. Гардзееў. «Магдэбургская Гародня»
Д. Бічэль «Хадзі на мой голас»
А. Карпюк «Разьвітанне з ілюзіямі»
А. Вашкевіч, С. Токць «Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху. Пётр Сяўрук»
«Зрабаваны народ. Размовы з беларускімі інтэлектуаламі»
С. Шапран «Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця». У 2-х т. (выдадзена супольна з «Бібліятэкай Бацькаўшчыны»)

ВАНДРОЎКА

# АЎТАSTOPАМ ПА ЕЎРОПАМ

Раман АБРАМЧУК

◂ Працяг. Пачатак у №36

## Руска-латышскае супрацьстаянне

Да Рыгі мяне падвозіў рускі дальнабойшчык, жыхар Латвіі. Калі першы сустрэты жыхар краіны пачынае скардзіцца на безграшоўе і беспрацоўе, нацыяналізм і бяздзейнасць новай улады — усё, з чым пастаянна асацыююць Латвію нашы дзяржаўныя тэлеканалы, — міжволі насцярожваешся.

Але ўсё выдатна, мяне сустракаюць вострыя шпілі ганзейскага горада на Дзвіне — сапраўдныя сярэднявечныя абрысы.

Начлег у знаёмых маіх знаёмых у старым доме непадалёк ад Домскага сабору.

Вельмі спадабалася, як латышы ўдала абыгрываюць кватэрную прастору. Адна са сцен кватэры, сумежная са старажытным манастыром — сярэднявечная муроўка. Атынкоўваць не сталі. І вы можаце спаць каля гэтай старой цэглы пад драўлянай бэлькай. Не хапае толькі скуры мядзведзя пад ногі і фрэсак над галавой. Іншы, зусім маленькі пакой з дапамогай фантазіі і фанеры падзяляецца гарызантальна на дзве часткі: наверсе — ложак, унізе — прастора для кампутара і іншага. Глухі замкнёны дворык, агульны з суседзямі, куды вядзе кватэрнае вакно, ператвараецца ва ўтульную тэрасу са столікам і крэсламі.

Яшчэ здзівіла, што замест ванны — душ і маленькая сауна. Па словах гаспадыні, гэта даволі распаўсюджана ў Латвіі.

Вуліцы Рыгі. Сустракаеш рускамоўных інтэлігентаў, што зусім не характэрна для Вільні. Увогуле, руска-латышскае супрацьстаянне — рэальная праблема Латвіі. Грамадства падзелена сцяной непаразумення. Рускія крыўдзяцца, латышы радыкаляць. Калі выслухоўваеш рускага — разумееш, пагаджаешся. Калі размаўляеш з латышом, даведваешся пра тое, як праводзілася русіфікацыя, планавае засяленне Латвіі рускімі, — цяжка не абурыцца.

«Музей акупацыі 1941–1991». Гэта новы музей, у самым цэнтры Рыгі, бясплатны. Выдатная падборка дакументаў уражвае і кранае — бясчынства сталінскіх часоў, лагеры, КДБ і г.д. Асноўная ідэя музея: для латышоў не было розніцы, якая ўлада прыйшла. І фашысты, і саветы былі акупантамі. Ніякіх «знакаў прыхільнасці» ці апраўдання фашыстаў у гэтым музеі я не ўбачыў. У розных кутках музея размешчаны шахматы, зробленыя зняволенымі сталінскіх лагераў. Фігуркі ў выглядзе канваіраў, вайскоўцаў, ладдзя — назіральная ГУЛагаўская вышка.



Фота аўтара

## Зайздросцяць беларусам

Чым яшчэ запомнілася Латвія? Грашыма. Не разумею, чаму ў даволі небагатай краіны такія дарагія грошы. 1 лат роўны прыкладна 1,7 еўра. Адпаведна, усе латышскія санцімы набываюць неверагодна вялікую каштоўнасць у вашых кішэнях. Славянская душа, што звыклася шчодра сыпаць капейкамі, не можа змірыцца з такой неабходнасцю ашчаднага стаўлення да дробязі. Ды тут яшчэ латышскія кошты... Латвія — вельмі дарагая краіна.

Увогуле, гэта краіна — другая ў Еўропе, што найбольш пацярпела ад крызісу. Ніводзін знаёмы не абмінуў мне сказаць пра гэта. Кожнага, каго сустрэў, гэта кранула за жывое. Бо Латвія, як паведаміла знаёмая, — «краіна-эмбрыён», з вялікай галавой — Рыгай, што жыве без вялікага сектара ўласнай вытворчасці. Менавіта з-за гэтага латышы нам і зайздросцяць зараз. Гэта мне распавяла дзяўчына, уладальніца музычнага бара ў цэнтры Рыгі. Яна сказала, што многія ў яе ўзросце (каля 30-ці) бяруць крэдыт і пачынаюць сваю справу прыкладна такога ж кшталту. Бар, дзе граюць музыку, якая табе падабаецца, бар, аформлены па тваім гусце... У Латвіі здзейсніць сваю мару значна прасцей, чым у нас. У гэтым ім можна пазайздросціць.

Мяне ўразіла адна кавярня, зробленая ў аўтэнтычных сутарэннях нямецкай піўніцы XIII стагоддзя. Там-сям засталіся фрэскі.

## Тарту — студэнцкі «парадыз»

Цяжкі спын Рыга—Тарту. Як паведамілі пазней тартускія спыняры, трэба ездзіць не наўпрост, а праз Пярну. Нашмат хутчэй, хоць з вялікім гакам. Праязджаючы па Латвіі, аглядаючы цудоўныя краявіды і слухаючы расповеды вадзіцеля-дзяўчыны, якая жыве на беразе мора, разумееш, што Латвіі ты амаль не бачыў. Рыга — гэта хіба толькі траціна.

Але вось — праз цяжкі і аднначасова неверагодны начны спын — Тарту сустракае медная свіннёй-манументам у цэнтры на месцы старога рынку.

Рамантыкі з тартускага геафака, самі спыняры, сустрэлі мяне на роварах, пасадзілі на багажнік, адвезлі ў каюту старажытнай ладдзі на начлег, накармілі-напаілі. І адправілі назаўтра ў падарожжа па Чудскім возеры ў хаўрусе з групай турыстаў і эстонскім традыцыйным музыкам... Сама ладдзя — прыклад, як мара энтузіяста можа рэалізавацца ў паспяховы праект, асветніцкі і прыбытковы аднначасова. Ладдзя «Jummu» — рэканструкцыя старых эстонскіх караблёў, якая гарманічна спалучае ў сабе камфорт, неабходны сучаснаму турысту, і старажытныя элементы. У вольны ад турыстычных заказаў час ладдзя курсуе з майстар-класамі па старадаўніх рамёствах, асветніцкімі гістарычнымі фільмамі.



Фота аўтара

Тарту — студэнцкі гарадок. Ледзь не палова жыхароў — студэнты. Тартускі універсітэт з яго найстарэйшымі традыцыямі выхаваў не толькі цудоўных навукоўцаў, але і сфармаваў добрыя традыцыі студэнцкага жыцця. Прыкладам таму — клуб «Геніяльнасці», які нагадвае кватэру для сваіх, з утульнымі канапамі, паліцамі, дзе стаяць кнігі тваёй супольнасці, крамай дыскаў з музыкай, якую слухаюць у гэтай супольнасці. Тут жа бар, на другім паверсе — свойская дыскатэка. Часам тут ладзяцца прагляды фільмаў, тэатральныя пастаноўкі студэнцкага тэатра з абмеркаваннем.

Ідучы па горадку, паўсюдна заўважаеш імёны славутых навукоўцаў, якія ў цябе на слыху: Струвэ, Лотман, Пірагоў... Дарэчы, пра Юрыя Лотмана тут чулі ўсе, хоць і не ведаюць, чым ён увогуле займаўся. Помнік яму — сямейтыка чыстай вады: твар навукоўца памерам у некалькі метраў выраблены з хаатычна пераплеценых металічных труб, якія аднначасова з'яўляюцца фантанам.

## Паміж Скандынавіяй і Масквой

У Латвіі гавораць: «Вось там, на Захадзе, а вось у нас, у Латвіі...» А эстонцаў у Латвіі лічаць ужо еўрапейцамі-скандынавамі. Цікава, але эстонцы сябе таксама прылічаюць да тых, хто паміж еўрапейскай Скандынавіяй і Масквой... І крыху камплексуюць перад фінамі, з якімі маюць падобную мову і культуру, але жывуць папрасцей. А фіны, у сваю чаргу, камплексуюць перад шведамі, бо не мелі свайго каралеўства, заўжды былі простым, пераважна сялянскім народам (і ў гэтым сваім пачуцці падобныя да беларусаў, нягледзячы на наша шляхетнае мінулае часоў ВКЛ). Цікава, перад кім камплексуюць шведы? Чую, што шведы адчуваюць сябе сціпла перад датчанамі.

Тарту — пераважна драўляны гарадок. Вы бачылі ў Мінску драўляныя баракі сталінскіх часоў, двухпавярховыя? Знешне вельмі нагадвае пабудовы ў Тарту. Такія дамкі сустракаюцца і ў Латвіі, і ў Эстоніі, і ў Фінляндыі — у сталіцах і маленькіх гарадках. Гэту мясцовую традыцыю будаўніцтва багатых на лес крайнаў не змаглі выцесніць нямецкія каменіцы Рыгі і Таліна.

Але вось я ўжо ў Таліне. Шпілі, вулачкі, вежы, брук цудоўна стасуюцца з вашымі ідэалізаванамі рамантычнымі ўяўленнямі пра сярэднявечны горад. Магчыма, гэты архетып закладзены на падсвядомым узроўні «Прыгодамі электроніка» і іншымі савецкімі фільмамі, дзе «бьют часы на старой башне». Адметнасць горада — стары завод непадалёк ад порта, на якім Андрэй Таркоўскі часткова здымаў «Сталкера» (пра гэта сведчыць памятная дошка на высачэзнай дымавой трубе).

Працяг будзе

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 9.10.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.